ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 41 (2298)
24 мая 1968 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

МІЖНАРОДНЫ ТЭЛЕВІЗІЙНЫ

19 мая ў Сафіі ўрачыста адкрыўся Першы міжнародны фестываль тэлевізійных тэатраў краін Інтэрбачання. На фестывалі будзе прадстаўлена 15 тэлевізійных спектакляў студый тэлебачання Савецкага Саюза, Балгарыі, ГДР, Венгрыі, Румыніі, Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі і Фінляндыі.

У міжнародным фестывалі тэлевізійных тэатраў удзельнічае і Беларускае тэлебачанне. Членам журы і шматлікім гасцям фестывалю будзе паказаны двухсерыйны тэлевізійны спектакль «Крах» у пастаноўцы заслужанага дзеяча мастацтваў БССР В. Карпілава па п'есе А. Талстога і П. Шчогалева «Змова імператрыцы». Цікава, што гэты твор А. Талстога і П. Шчогалева — першая савецкая п'еса, пастаўленая ў Балгарыі яшчэ ў сярэдзіне 20-х гадоў.

У якасці члена журы ў рабоце фестывалю прымае ўдзел галоўны рэдактар літаратурна-драматычных перадач Беларускага тэлебачання Р. Александровіч.

На Першым міжнародным фестывалі тэлевізійных тэатраў устаноўлены наступныя прызы і ўзнагароды: тры галоўныя прэміі за лепшыя тэлеспектаклі, спецыяльныя ўзнагароды за лепшы сцэнарый, лепшую рэжысуру, за лепшае выкананне мужчынскай і жаночай ролі і за лепшую работу мастака. Тэлевізійныя спектаклі, якія атрымаюць галоўныя прызы, будуць паказаны потым па тэлебачанні ва ўсіх краінах—удзельніцах Інтэрбачання.

ДА СЯБРОЎ-ЛЕНІНГРАДЦАЎ

4 чэрвеня пачынаецца Тыдзень беларускай літаратуры ў Ленінградзе.

— У апошнія гады пісьменнікі Беларусі мелі нямала радасных і плённых сустрэч з літаратарамі Расіі і рускімі чытачамі,— сказаў карэспандэнту газеты «Літаратура і мастацтва» сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Мікола Ткачоў.— Можна назваць добра памятныя нам паездкі беларускіх пісьменнікаў па Сібіры, Уралу, Далёкім Усходзе, мінулагоднія сустрэчы і літаратурныя вечары падчас Дзён культуры і мастацтва БССР у Маскве.

Цяпер — з 4 па 10 чэрвеня — беларуская літаратура будзе сустракаць у Ленінградзе. Мы чакаем гэтай сустрэчы з асаблівым пачуццём і рыхтуемся да яе з вялікім хваляваннем. Пісьменнікаў Беларусі будзе прымаць горад, якому належыць выдатнае месца ў гісторыі нашай Радзімы,— горад, які носіць імя вялікага Леніна, калыска рэвалюцыі, горад-герой, бясспрыкладны подзвіг якога ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўвойдзе ў вякі, выдатны цэнтр рускай культуры і літаратуры, горад, у якім жылі і пісалі Пушкін, Гогаль, Някрасаў, Дастаеўскі, Блок...

Мы радуемся і ганарымся, што беларуская культура і літаратура мае значныя і багатыя даўнія сувязі з легендарным горадам.

Яшчэ на пачатку стагоддзя менавіта тут, на неўскіх берагах, распачалася дзейнасць першай беларускай выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца», тут выходзілі першыя кніжкі пачынальнікаў нашай літаратуры і яе волатаў Купалы і Коласа.

Шмат шчырых і адданых сяброў мела і мае ў Ленінградзе і беларуская савецкая літаратура. У тым, што сёння, напярэдадні 50-годдзя БССР, многія творы нашай літаратуры дайшлі да рускага, а значыць і ўсесаюзнага чытача, ёсць вялікая заслуга ленінградскіх літаратараў. Мы вельмі ўдзячны лаўрэату Ленінскай прэміі А. Пракоф'еву, пісьменнікам У. Раждзественскаму, М. Брауну, М. Камісаравай, Б. Кежуну, Л. Хаўставу, П. Журу, нястомным перакладчыкам П. Кабзарэўскаму і А. Астроўскаму і многім іншым нашым ленінградскім сябрам, якія шмат рабілі і робяць, каб пазнаёміць рускіх чытачоў з нашай літаратурай. Варта адзначыць, што за гады Савецкай улады ў выдавецтвах Ленінграда выйшлі дзесяткі беларускіх кніг, а калі ўспомніць усе кнігі, у перакладзе якіх прымалі ўдзел ленінградскія пісьменнікі, то лік іх пойдзе на сотні.

Беларускіх літаратараў чакаюць сустрэчы з даўнімі сябрамі і добрымі знаёмымі: не ўпершыню едзе ў Ленінград пісьменніцкая дэлегацыя Беларусі, неаднойчы былі ў нашай рэспубліцы пісьменнікі Ленінграда...

Цяпер аб тым, як будзе праходзіць Тыдзень. Нашы сябры прапануюць багатую і разнастайную праграму. Вядома, што галоўнае ў ёй — сустрэчы з ленінградцамі, выступленні перад чытачамі ў тэатральных і актавых залах, у клубах і на адкрытых пляцоўках. Беларускія пісьменнікі разам з пісьменнікамі Ленінграда выступяць на заводах і фабрыках, у культурных і навучальных установах горада.

Запланавана, напрыклад, вялікае выступленне на славутым Кіраўскім заводзе. Варта напомніць, што гэта не першая сустрэча нашых пісьменнікаў з кіраўцамі — яшчэ ў 1947 годзе ў заводскіх цэхах выступалі Я. Колас, М. Лужанін, П. Пестрак і іншыя беларускія пісьменнікі. Пасланцы Беларусі сустрэнуцца таксама з калектывамі буйнейшых заводаў горада — Балтыйскага суднабудаўнічага і Металічнага імя XXII з'езда КПСС...

Гэта — у першыя дні. Потым нас чакае таксама нямала цікавых сустрэч і выступленняў. 7 чэрвеня адбудзецца паездка ў марскі фарпост Ленінграда — Кранштат. Нашы пісьменнікі разам з ленінградскімі калегамі наведаюць караблі Балтыйскага флоту, выступяць перад маракамі.

У гаркоме партыі пісьменнікі Беларусі сустрэнуцца з партыйнымі кіраўнікамі і грамадскасцю горада.

У гэтыя дні беларускае мастацкае слова будзе гучаць па гарадскім радыё і тэлебачанні; газеты і часопісы падрыхтавалі да Тыдня пераклады твораў нашых пісьменнікаў.

Цяжка пералічыць усе мерапрыемствы Тыдня, запланаваныя паездкі і выступленні. Сярод іх — паездка ў Разліў, наведванні Смольнага, у якім жыў і працаваў Ленін у першыя дні Кастрычніка, музея-кватэры Пушкіна, Эрмітажа, Петрадварца, сустрэчы і выступленні ў дзіцячым гарадку «Сонейка» і ў Зялёным тэатры.

Нашы пісьменнікі пабываюць на Піскароўскіх могілках і ўшануюць памяць ленінградцаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне горада, наведаюць магілу слаўнага сына беларускага народа, славутага снайпера Героя Савецкага Саюза Ф. Смалячкова...

10 чэрвеня ў гарадскім пісьменніцкім клубе імя У. У. Маякоўскага адбудзецца заключны вечар, на якім гаспадары і госці падзеляцца думкамі аб сувязях нашых літаратур, уражаннямі ад сустрэч, прачытаюць свае творы... Як бачыце, праграма Тыдня вельмі багатая.

Хто будзе прадстаўляць беларускую літаратуру ў Ленінградзе? Дэлегацыю ўзначальвае першы сакратар Саюза пісьменнікаў БССР Максім Танк. У складзе яе—Пятрусь Броўка, Васіль Вітка, Ніл Гілевіч, Кастусь Кірэенка, Аляксей Кулакоўскі, Максім Лужанін, Андрэй Макаёнак, Іван Мележ, Іван Навуменка, Іван Сіпакоў, Уладзімір Юрэвіч.

Па дарозе ў Ленінград наша дэлегацыя завітае ў пушкінскія мясціны на Пскоўшчыне, пабудзе ў Міхайлаўскім на традыцыйным Усесаюзным Дні паэзіі.

Несумненна, Тыдзень беларускай літаратуры ў Ленінградзе падорыць яго удзельнікам шмат цікавых уражанняў, прынясе добрую карысць нашай узаемнай дружбе з горадам Леніна, плённа паслужыць сувязям братніх літаратур рускага і беларускага народаў.

УСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ 1968 50 МАЙСТРОЎ ОПЕРНАГА І БАЛЕТНАГА МАСТАЦТВА МАЙ-1968

АПЛАДЗІРУЕ ЎСЯ БЕЛАРУСЬ

Дзесяты дзень працягваецца Усесаюзны фестываль майстроў балетнага і опернага мастацтва. Многанацыянальны, шматгалосы, маляўнічы, ён прайшоў па ўсёй рэспубліцы. Яго ўдзельнікі былі гасцямі фабрык і заводаў, калгасаў і саўгасаў. На оперных спектаклях, канцэртах і сустрэчах пабывалі многія тысячы гледачоў: рабочыя, калгаснікі, студэнты.

З вялікім поспехам прайшлі ў апошнія дні оперныя і балетныя спектаклі «Чыо-Чыо-сан», «Яўгеній Анегін», «Трубадур», «Баядэрка» з удзелам такіх майстроў сцэны, як Г. Вішнеўская, Л. Чконія, М. Аміранашвілі, Я. Райкоў, Ю. Гуляеў, Х. Крум, К. Федзічава, Ю. Салаўёў і шмат іншых. У некаторых спектаклях розныя партыі выконваліся на розных мовах. Але і акцёры і гледачы выдатна разумелі адзін аднаго, таму што вялікае і сапраўднае мастацтва заўсёды знаходзіць шлях да сэрца.

Канцэрты ў гэтыя дні ішлі па асобым графіку. Яны пачыналіся рана. Ужо ў 11 гадзін раніцы артысты займалі месцы ў службовых аўтобусах, каб да абедзеннага перапынку, да 12-ці паспець, скажам, на трактарны. А крыху пазней, у чатыры гадзіны дня, іх ужо віталі рабочыя станкабудаўнічага.

Песням і танцам удзельнікаў фестывалю апладзіруе ўся Беларусь.

Набліжаецца час развітання. Фестываль заканчваецца. Паслязаўтра — заключны канцэрт.

МЫ НЕ ГАВОРЫМ—БЫВАЙЦЕ, МЫ ГАВОРЫМ—ДА ПАБАЧЭННЯ!

Галіна КЛЕСАВА,
начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення культуры

18 і 19 мая да нас, у Віцебск прыехалі госці—удзельнікі фестывалю, прысвечанага 50-годдзю нашай рэспублікі. Не магу перадаць словамі, якое гэта было для нас свята. Мы не можам паскардзіцца, што да нас рэдка заглядваюць музычныя калектывы і асобныя выканаўцы—не. Але вось оперныя спевакі, на жаль, прыязджаюць рэдка. І тут раптам такі наезд. Нашы старыя знаёмыя А. Генералаў, Л. Бражнік, Н. Нікеева, А. Бокаў і праслаўленая на ўвесь свет Т. Мілашкіна, госці з Грузіі, Украіны, Арменіі, Літвы, Латвіі. Адным словам—усе флагі...

Мы іх сустракалі не толькі па ўсіх законах гасціннасці: хлеб-соль, кветкі, апладысменты. Мы іх сустракалі перш за ўсё—з любоўю, з павагай, з раскрытымі сэрцамі. Білеты былі прададзены літаральна за некалькі гадзін. Вядома, Палац культуры Упраўлення бытавога абслугоўвання не мог змясціць усіх жадаючых — многім і многім давялося сядзець ля тэлевізараў. Ну, а шчасліўчыкі, якія былі на канцэрце, надоўга запомняць яго. Я не музыказнаўца, я магу гаварыць толькі як гледач—нас зачараваў голас Т. Мілашкінай, нас пакарыла балетная пара з Ленінграда—Макараў і Пятрова, нам далі бязмежную радасць спявачкі Н. Тугушы і Э. Узунян. І адзінае, што азмрочвала нашу радасць, — гэта страх, што канцэрт хутка закончыцца.

Такі ж канцэрт адбыўся і на другі дзень. У кароткія перапынкі паміж рэпетыцыямі і канцэртамі мы пазнаёмілі гасцей з нашым горадам, яго новабудоўлямі, пабывалі на магіле бацькі Міная, выехалі за горад. Два дні праляцелі імкліва. Развітваючыся з сябрамі-артыстамі, мы гаварылі ім «да пабачэння», таму што спадзяёмся на хуткія і частыя сустрэчы.

НЯХАЙ ДРУЖБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Г. ГАЛІНСКІ,
дырэктар Наваполацкага Палаца культуры нафтавікоў

Зусім нядаўна адкрыўся наш цудоўны Палац культуры нафтавікоў, але мы яго ўжо, як кажуць, абжылі.

На нашай сцэне выступалі артысты з Масквы, Мінска і іншых гарадоў Савецкага Саюза. Але такіх гасцей, як зараз, у дні фестывалю опернага і балетнага мастацтва, мы яшчэ не прымалі. Некалькі дзён мы рыхтаваліся, хваляваліся. І вось, нарэшце, дзень прыезду. З букетамі бэзу, бледна-ружовых і белых півоняў, чырвоных гваздзікаў мы селі ў аўтобус і паехалі насустрач нашым гасцям. Яны ехалі да нас з Полацка — там напярэдадні адбыўся вялікі канцэрт. Нашы аўтобусы сустрэліся на дарозе. Мы выйшлі з машын, уручылі гасцям кветкі, пазнаёміліся. Артысты з цікавасцю аглядалі наш горад, гутарылі з людзьмі, якія пазнавалі іх на вуліцах і шчодра дарылі ім усмешкі, добрыя словы.

Увечары адбыўся канцэрт. У ім прынялі ўдзел грузінская спявачка Н. Тугушы, госця з Арменіі Э. Узунян, прадстаўнік латвійскага мастацтва А. Экіс, саліст Адэскай оперы А. Скрыпкін, беларускія артысты Л. Бражнік, А. Генералаў, А. Бокаў, А. Валожын і іншыя. Удзячныя гледачы доўга не адпускалі гасцей.

На развітанне мы пажадалі ім дастойна прадстаўляць наша яркае многанацыянальнае мастацтва ўсюды, але час ад часу зноў заглядваць да нас, у Наваполацк, у наш палац.

ГЭТА БЫЛО ЗДОРАВА

У. ХУДОБІН,
майстар 5-га цэха завода аўтаматычных ліній

Штодзённа хадзіць на спектаклі і канцэрты фестывалю не маю магчымасці — работа, хатнія справы... Але ж ніводнай перадачы па тэлебачанню не прапускаю. Пашчасціла мне толькі папасці на адкрыццё фестывалю—гэта было здорава! Асабліва спадабаўся ўкраінскі спявак А. Салаўяненка. Вось гэта голас!

Вядома, вельмі прыемна, што напярэдадні юбілею нашай рэспублікі з'ехаліся да нас славутыя спевакі і салісты балета, каб разам з намі адзначыць наша свята, перадаць прывітанні ад братніх народаў нашай краіны, паказаць сваё майстэрства.

АДЧУВАЮ САПРАЎДНУЮ РАДАСЦЬ

Фелікс ПЕТРУСЕЎ,
інжынер мантажна-будаўнічага ўпраўлення «Промналадка»

Шчыра кажучы, да оперы ў мяне адносіны складаныя. З аднаго боку—цудоўная музыка і галасы спевакоў, а з другога—чыста оперная ўмоўнасць, якая асабліва кідаецца ў вочы тады, калі спектакль грунтуецца на сюжэце аднаго з найвялікшых твораў сусветнай літаратуры.

У спектаклі «Яўгеній Анегін» была і прыгожанькая Вольга, і мілы летуценны Ленскі. Быў вельмі добры Грэмін (яго партыю выконвае саліст Беларускага тэатра оперы і балета Аскольд Сухін).

І ўсё-такі гэты спектакль быў бы звычайны, калі б не Галіна Вішнеўская. Перад намі была пушкінская, менавіта пушкінская Тацяна з «умом и волею живой» і «сердцем пламенным и нежным».

У оперы няма гэтага пушкінскага тэксту, а вось Тацяна ёсць—Галіна Вішнеўская дасягае гэтага дзівосным яднанням з музыкай П. Чайкоўскага, выдатнай ігрой і, вядома, голасам, які перадае найтанчэйшыя адценні, драматычныя рухі душы гераіні: то пяшчотныя, то сумныя, то страсныя...

Што і казаць, гэты спектакль для мяне — падзея: я адчуваю тую сапраўдную радасць, якую атрымліваеш толькі ад сустрэчы з вялікім мастацтвам.

Элеанора Том у ролі Азучэны ў спектаклі «Трубадур».

Нона Суржына ў ролі Вольгі ў спектаклі «Яўгеній Анегін».

Юрый Гуляеў у ролі графа Ды Луны ў спектаклі «Трубадур».

Хендрык Крум у ролі Манрыка ў спектаклі «Трубадур».

ПЕСНЯ ГУЧЫЦЬ У ЦЭХУ

Калі аўтобус ад'ехаў ад гасцініцы «Мінск» і, зрабіўшы круг па плошчы, нырнуў на заліты сонцам праспект, Яніс Забер, саліст Рыжскага тэатра оперы і балета, заслужаны артыст Латвійскай ССР, блакітнавокі прыгажун і вельмі вясёлы чалавек сказаў:

— От, добры сёння ў нас аўтобус, утульны, усё перад вачыма, усё побач, аж цяплей робіцца...

Аўтобус наш быў, шчыра кажучы, даволі стары, але пасля слоў Яніса ўсім і сапраўды стала цяплей — пачаліся размовы, пасыпаліся жарты, прыйшоў той асабліва вясёлы, ледзьледзь нервовы настрой, які бывае заўсёды перад канцэртам...

На заводзе аўтаматычных ліній гасцей ужо чакалі, але да абедзеннага перапынку, калі яны павінны былі выступіць, заставалася яшчэ амаль паўгадзіны. І госці разбіраліся па заводу. Станкі-гмахі, амаль поўная цішыня ў цэхах, велізарныя памяшканні і недзе пад самай столлю кран-балкі з вельмі дзелавымі, сур'ёзнымі дзяўчатамі ў стракатых гнёздах-кабінках...

Зразумела, ленінскі пакой малаваты, каб змясціць усіх, хто хацеў паслухаць канцэрт, але выйсце знайшлі. Спрытныя хлопцы разматалі шнур, прынеслі мікрафоны, дзелавіта памітусіліся ля іх — і вось ужо голас Маргарыты Антонавай, намесніка сакратара парткома, якая вітала гасцей, загучаў ва ўсіх цэхах, ва ўсіх памяшканнях завода...

І калі пачуліся першыя гукі цудоўнага голасу Лідзіі Шаўчэнка, салісткі Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, якая спявала старажытную рускую песню «Волга-рэчанька», засвяціліся вочы слухачоў...

Доўга не адпускалі рабочыя гасцей: салістку Харкаўскага опернага тэатра Нону Суржыну, саліста Ленінградскага тэатра імя Кірава Уладзіміра Кіняева, які, дарэчы, у 1957 годзе скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя Глінкі, саліста Рыжскага опернага — Яніса Забера, які проста пакарыў усіх цудоўнымі неапалітанскімі песнямі. Ціха і ўрачыста было ў зале, калі народная артыстка Беларускай ССР Лідзія Галушкіна выконвала арыёзу Маці з кантаты Новікава «Нам патрэбен мір», — то з ціхім смуткам аб долі маці, якая страціла сына, то з гневам да тых, хто запаліў і зноў збіраецца запаліць пажар вайны...

Вельмі сардэчнай была сустрэча, вельмі не хацелася развітвацца, але час ёсць час, кожная мінута заводу дарагая. Вось і апошнія словы развітання, уключаны станкі, і зноў старэнькі ўтульны аўтобус вязе нас па Мінску. У ім шчырае і шумнае ажыўленне. І, быццам падводзячы рэзюме сённяшняму канцэрту, наша госця Нона Суржына кажа:

— Не, для такіх людзей можна спяваць бясконца. І нават не адчуеш стомы...

А. БЕЛАВУСАЎ.

ДНІ ЗНАЁМСТВАЎ, ТВОРЧАЙ ВУЧОБЫ

Пяты дзень на беразе Свіцязі працуе рэспубліканскі семінар творчай моладзі. Пяты дзень маладыя літаратары, мастакі, кампазітары, артысты і архітэктары вядуць тут творчыя спрэчкі і дыскусіі, наладжваюць абмеркаванні твораў сваіх калег, вучацца і адпачываюць.

Пачаўся семінар, як мы паведамлялі, у панядзелак, 20 мая. Раніцою некалькі аўтобусаў з удзельнікамі семінара-нарады адышлі ад будынка ЦК ЛКСМБ і ўзялі кірунак на Свіцязь. У Стоўбцах аўтобусы звярнулі з шашы Масква — Брэст — у родныя мясціны народнага паэта Якуба Коласа: у Мікалаеўшчыну, дзе ён нарадзіўся, у Смольню, дзе некалі ўпершыню сустрэліся два вялікія песняры зямлі беларускай — Янка Купала і Якуб Колас.

Позна ўвечары 20 мая адбылося ўрачыстае адкрыццё семінара-нарады. Творчую моладзь рэспублікі віталі сакратар ЦК ЛКСМБ А. Ваніцкі, першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў М. Танк, сакратар Навагрудскага райкома партыі К. Кондырава.

На наступны дзень удзельнікі семінара праслухалі лекцыі «Вялікі Кастрычнік і ўтварэнне БССР» кандыдата гістарычных навук, вучонага сакратара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ Я. Бараноўскага, «Перспектывы развіцця эканомікі і культуры БССР» кандыдата геаграфічных навук У. Навіцкага і «Праблемы сацыяльнай псіхалогіі» кандыдата педагагічных навук Я. Каламінскага.

Вечарам таго ж дня яны глядзелі новы фільм беларускіх кінематаграфістаў «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка», пастаўлены па раману У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гродна».

У гэты ж дзень група пісьменнікаў — М. Танк, Я. Брыль, А. Вярцінскі, П. Макаль, Б. Сачанка, А. Кудравец і брат Якуба Коласа — дзядзька Юзік — пабывалі ў гасцях у вучняў Валеўскай сярэдняй школы.

Серада на семінары была днём літаратуры. Зранку ўдзельнікі і госці семінара правялі дыскусію аб сённяшнім стане нашай маладой прозы і паэзіі, аб праблемах і задачах, якія стаяць перад літаратурнай моладдзю рэспублікі. У гэтай дыскусіі прынялі ўдзел Я. Брыль, У. Гніламёдаў, Б. Сачанка, М. Стральцоў, аператар студыі «Беларусьфільм» Ю. Марухін, кінарэжысёр І. Дабралюбаў, мастачка Н. Паплаўская, дырэктар Палаца культуры Магілёўскага завода штучнага валакна М. Левінаў, М. Федзюковіч, А. Вярцінскі, кіраўнік народнага хору Палаца культуры прафсаюзаў У. Журовіч.

Удзень удзельнікі семінара наведалі Навагрудак. Яны пабывалі ў Домемузеі вялікага польскага паэта А. Міцкевіча, на кургане Бяссмерця, насыпанага ў яго гонар, ля руін замка Міндоўга. А ўвечары адбылося вялікае свята маладой паэзіі «Галасы роднага краю». Вёў вечар Я. Брыль. Маладыя паэты В. Лукша, Л. Ганчарова, Т. Навумчык, П. Сушко, С. Хадаронак, Р. Баравікова, В. Жуковіч, Л. Якубовіч, М. Дукса, С. Законнікаў, Л. Дайнека і іншыя чыталі вершы, а маладыя кампазітары, кіраўнікі народных хораў В. Гарбатоўскі, У. Журовіч, А. Шутаў выконвалі свае песні, у тым ліку песні на словы паэтаў — удзельнікаў семінара.

Учора на семінары быў дзень выяўленчага мастацтва.



Сустрэча ўдзельнікаў Усесаюзнага фестывалю майстроў опернага і балетнага мастацтва з рабочымі Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Выступае госць з Азербайджана Уладзімір Лакшын.

Будні мастакоў

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ІЛЬІЧУ

Выстаўка прысвечаных Уладзіміру Ільічу Леніну твораў М. Бельскага адбылася ў Беларускім політэхнічным інстытуце, дзе мастак працуе выкладчыкам на кафедры малюнка, акварэлі, скульптуры.

У экспазіцыю выстаўкі ўвайшлі ілюстрацыі да паэмы П. Глебкі «У тыя дні», да кнігі І. Гурскага «На берагах Нявы», да кнігі В. Хомчанкі «Чырвоны мак», якую М. Бельскі афармляў разам з мастакам П. Калініным. Паказаны лісты з серыі «Уладзімір Ільіч Ленін. 1917 год», работы, у якіх правадыр— у Петраградзе 1919 года, у Маскве 1921 года, творы «Ул. І. Ленін на парадзе войск Усенавуча. Масква, 1919 год», «Ул. І. Ленін пасля ранення. Масква, 1921 год» і іншыя.

ГЛЕДАЧАМ ВІЦЕБСКА

Актывізавалася выставачная дзейнасць у Віцебску. Тутэйшыя мастакі трымаюць творчыя справаздачы перад працоўнымі.

У клубе чыгуначнікаў пейзажы Беларусі, Крыма і серыю партрэтаў сучаснікаў паказаў гледачам А. Каржанеўскі. У Палацы культуры домабудаўнічага камбіната адбылася выстаўка твораў Ул. Кухарава, у Тэхналагічным інстытуце—М. Явіча, у медыцынскім—І. Бароўскага.

Маладыя мастакі Віцебска трымалі творчую справаздачу на заводзе імя Кірава. Тут экспанаваліся трыпціх А. Арлова, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, пейзажы Я. Красоўскага, лінагравюры А. Някрасава.

У Тэатры імя Якуба Коласа наладзілі выстаўку сваіх твораў тэатральныя мастакі Я. Нікалаеў і А. Салаўёў.

КЛІЧУЦЬ ДАРОГІ ДАЛЬНІЯ

Вясна прынесла на палітры мастакоў свае вясёлыя тоны. Яны, гэтыя тоны, зажылі новым жыццём у накідах, эцюдах, замалёўках М. Даўгялы, І. Карасёва, К. Максімцава, якія днямі вярнуліся з паездкі па Радашковіцкаму раёну. А тым часам другая група мастакоў — Ул. Стальмашонак, А. Паслядовіч, В. Сахненка, Г і Н. Паплаўскія—адпраўляецца ў дарогу па цудоўных кутках беларускага Палесся.

ДЫВАНЫ Ў ІНТЭР'ЕРЫ

На Віцебскім дывановым камбінаце створаны кутні сучасных жылых інтэр'ераў. Экспазіцыя разлічана на тое, каб наведвальнік мог убачыць, як правільна падабраць патрэбны па колеры, фактуры, памеры дыван у канкрэтную бытавую абстаноўку. Мастакі камбіната А. Салейнікава, З. Луданё, Т. Гусева, Н. Дзёмін, І. Шурупаў, В. Федаровіч паказалі эскізы новых дываноў, над якімі яны працуюць.

У МАЙСТЭРНЯХ МАГІЛЁЎЧАН

Рыхтуючыся да 50-годдзя БССР, магілёўскія мастакі працуюць над новымі творамі. У майстэрні М. Кірэева на станку палатно «Мост на Лаўсанбуд», прысвечанае нашым сучаснікам. Ул. Шпартаў піша карціну аб суровых ваенных падзеях, калі ў трывожным сорак першым магілёўчане стваралі лінію абароны горада.

Магілёўскія мастакі афармляюць музеі хімічнага завода і саўгаса «Цімкава», новы Палац культуры ў саўгасе «Баронькі», Бялыніцкі Дом культуры. Маладыя манументалісты, нядаўнія выпускнікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута М. Лазюк і В. Кузьміч ствараюць роспісы для магілёўскага кінатэатра «Кастрычнік».

Скульптары С. Дамарацкі і А. Скрыпко працуюць над помнікам, які мае быць устаноўлены на месцы спаленай фашыстамі вёскі Красная. С. Дамарацкі працуе таксама над манументам, які мяркуецца ўстанавіць на месцы Лупалаўскага лагера смерці. А. Скрыпко стварае помнік выкладчыкам і студэнтам сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

КОРАТКА

△ Выдавецтва «Беларусь» неўзабаве выпусціць сувенірныя выданні «Новай зямлі» Я. Коласа ў афармленні Г. Паплаўскага і зборніка партызанскіх вершаў «Лясныя песні» ў афармленні М. Гуціева. Рыхтуюцца да друку кніга паэзіі Ул. Караткевіча «Іліяда» (мастак Ул. Басалыга), «Сымон-музыка» Я. Коласа (мастак А. Кашкурэвіч), беларускія казкі «Дрога ўсяго многа» (мастак А. Лось).

△ У Магілёўскім педагагічным інстытуце адбылася выстаўка твораў М. Кірэева, які працуе тут выкладчыкам малявання.

△ Цацкі, адзенне для лялек, вырабы з саломкі, малюнкі і іншыя творы паказаны на абласной выстаўцы дзіцячай творчасці ў Віцебску. Асабліва радуюць гледачоў работы дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва, якой кіруе мастак В. Лук'янаў.

△ Перасоўная выстаўка твораў А. Паслядовіч, С. Раманава, Ул. Сакалова, І. Капляліна і іншых графікаў, прысвечаная 50-годдзю пагранічных войск, пачынае свой шлях у Брэсце.

Новыя назвы на афішах

Аксана — І. Шыкунова.

Франэса і Супонька — Т. Ніжнікава і В. Глушакоў.

Радаслаў і Мечык — А. Саўчанка і М. Пушкароў.

Гужавін — В. Чарнабаеў.

Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета пазнаёміў мінчан са сваёй чарговай работай—спектаклем «Калі ападае лісце». Гэта—новая опера беларускага кампазітара Юрыя Семянякі, напісаная па лібрэта Алеся Бачылы.

У ліку пастаноўшчыкаў спектакля — дырыжор І. Абраміс, галоўны рэжысёр тэатра Дз. Смоліч, галоўны мастак Я. Чамадураў, галоўны хормайстар А. Кагадзееў, галоўны балетмайстар А. Дадзішкіліяні. Сярод выканаўцаў — вядучыя салісты опернай і балетнай груп тэатра.

Сцэна са спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

УСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МАЙСТРОЎ ОПЕРНАГА і БАЛЕТНАГА МАСТАЦТВА

БЛІСКУЧАЯ ТЭХНІКА, АРТЫСТЫЗМ

Мінчанам пашанцавала! У сталіцы рэспублікі сабраліся зоркі савецкага опернага і балетнага мастацтва першай велічыні.

Сярод спектакляў, якіх з нецярпеннем чакалі ўсе,— «Лебядзінае возера» з народнай артысткай РСФСР Калерыяй Федзічавай у партыі Адэты-Адыліі і народным артыстам РСФСР Юрыем Салаўёвым у партыі Зігфрыда.

«Лебядзінае возера» з удзелам салістаў Ленінградскага тэатра оперы і балета імя С. М. Кірава станавілася падзеяй на балетных сцэнах Англіі і ЗША, Канады і Аўстрыі. «Гэта, бадай, самае трагічнае і рамантычнае «Лебядзінае возера»,— пісаў пра гэты спектакль аглядальнік газеты «Морнінг стар».

Ленінградская школа балета — старэйшая ў нашай краіне і, калі так можна сказаць, «самая класічная». Патрабаванне строгасці класічных форм — вось яе аснова. Каб даведацца, што такое сапраўдны балет, дастаткова паглядзець яго ў выкананні артыстаў Ленінградскага балета. Ен даў савецкай сцэне такіх цудоўных майстроў, як Галіна Уланава і Канстанцін Сяргееў, Наталля Дудзінская і Вахтанг Чабукіяні. Сёння іх традыцыі высока ўзнятыя І. Калпаковай, А. Сізовай, А. Макаравым, Н. Пятровай. І, зразумела, гэты спіс не можа быць поўным без Калерыі Федзічавай і Юрыя Салаўёва.

Калерыя Федзічава прыйшла ў Ленінградскі дзяржаўны тэатр оперы і балета адразу ж пасля сканчэння харэаграфічнага вучылішча — у 1955 годзе. Першая ж яе буйная роля — партыя Гаспадыні Меднай гары ў балеце «Каменная кветка»— з'явілася вялікай творчай удачай. Затым былі партыі Нікіі ў «Баядэрцы», Зарэмы ў «Бахчысарайскім фантане», Лаўрэнсіі ў аднайменным балеце. І, канечне ж, Адэта-Адылія ў «Лебядзіным возеры». У кожны з гэтых вобразаў Федзічава здолела ўнесці нешта сваё, якуюсьці сваю, «федзічаўскую» рысачку.

Юрый Салаўёў—з'ява ў сусветным балеце. Ужо на Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Вене бліскучае выканаўчае майстэрства маладога танцора было адзначана залатым медалем. А ў 1963 годзе Парыжская акадэмія танца ўручыла Юрыю Салаўёву, як лепшаму танцоўшчыку ў свеце, дыплом імя Вацлава Ніжынскага. У 1965 годзе ён атрымлівае залаты медаль на Міжнародным балетным конкурсе ў Парыжы. У Ленінградскі тэатр оперы і балета ён быў запрошаны адразу ж пасля сканчэння вучылішча, дзевяць гадоў назад. І ўжо ў першых сваіх партыях здзівіў усіх цудоўнай тэхнікай, бліскучым уменнем увайсці ў ансамбль, умельствам глыбока ўвасобіць задуму пастаноўшчыка. Есць у яго выкананні яшчэ адна дэталь, якая, на мой погляд, больш за ўсё адрознівае Салаўёва ад іншых выканаўцаў,— яго незвычайныя скачкі. Ен увесь час у паветры, але гэта не імклівы рэзкі, а плаўны палёт. У гэтым палёце праяўляецца і мяккі лірызм Салаўёва, і... яго схільнасць да роздуму. Нехта нават назваў гэта танцам, асветленым добраю ўсмешкай.

За гэтыя скачкі Юрыя Салаўёва часта называюць «касмічным Юрыем». Але выкананне ім партыі Зігфрыда ў «Лебядзіным возеры» прымусіла мяне паглядзець на гэтую характарыстыку па-новаму. Так, і ў гэтай партыі яго скачкі дасягаюць «касмічнай» вышыні. Але гэта вельмі зямны Юрый. Бо яго Зігфрыд — звычайны чалавек, звычайны зямны рамантык, захоплены мяцежным пачуццём любові. І ён пакутуе, як пакутуе звычайны зямны чалавек, і змагаецца за сваё каханне, як і павінен змагацца зямны чалавек.

Два гады назад крытыкі пісалі, што ў выкананні Салаўёвым партыі Зігфрыда адлюстравалася супярэчнасць між Салаўёвым-танцорам і Салаўёвым-артыстам. Сёння, па-мойму, артыст шмат у чым наблізіўся да танцора. Дастаткова прыгадаць хаця б сцэну, калі Зігфрыд дае Адэце клятву вернасці. Або яго адчай, калі высвятляецца падман і Зігфрыд міжволі парушае клятву. Гэтыя сцэны Юрый Салаўёў не толькі бліскуча станцаваў, але і цудоўна сыграў. Кожны яго жэст, кожны паварот галавы, выраз вачэй—цэлая гама перажыванняў і пачуццяў. Без гэтай акцёрскай ігры перад намі не было б таго зямнога чалавека, які характэрны для Зігфрыда—Салаўёва. Ніякая тэхніка не ўратуе артыста балета. Бо нават для таго, каб раскрыць унутраны псіхалагічны бок танца, трэба быць артыстам. Салаўёў раскрывае гэты бок танца вельмі чула, перадаючы малейшыя нюансы ў настроі свайго героя. Вось ён—ахоплены раптоўна ўспыхнуўшым пачуццём да Адыліі. Гэта па-дэ-дэ з другой дзеі «Лебядзінага возера» я лічу самым яркім месцам спектакля. Іменна ў ім адначасова праявіліся і незвычайная зладжанасць дуэта Салаўёва—Федзічавай, і іх яркія выканаўчыя індывідуальнасці.

Калерыя Федзічава здолела, на мой погляд, знайсці новае рашэнне партыі Адыліі. У яе Адылія—гэта не столькі зло само па сабе, колькі зброя ў руках зла. З дапамогай гэтай зброі зло—Ротбард—спрабуе перамагчы дабро. Гэта небяспечная, вострая і... надзвычайна прыгожая зброя! Адылія ведае сабе цану, яна загадзя ўпэўнена ў поспеху. Можа таму Федзічава падкрэслівае ў гэтым вобразе спалучэнне ашаламляльнай прыгажосці і ўлады.

У той вечар «Лебядзіным возерам» дырыжыравала народная артыстка БССР Т. Каламійцава. Я спытаў, што, на яе думку, найбольш характэрнае для Федзічавай у Адэце-Адыліі. Т. Каламійцава, не задумваючыся, адказала: «Перш за ўсё цудоўная тэхніка і артыстызм. Не ўсім удаецца быць такой рознай у «белым» і «чорным» актах ...».

Нельга не пагадзіцца з гэтымі словамі. Мабыць іменна ва ўменні пераўвасабляцца, перадаваць змену настрояў і заключаецца тое галоўнае, што прыцягвае ў Федзічавай—Адэце. Яна мяняецца ўся: мяняецца яе паставa, «почырк» скачка, выраз вачэй, палёт рук. Вось яна ў тым жа па-дэ-дэ з другой дзеі. Урачыстасць стыхіі і страсці, імклівы запал, выклік! А вось яна ў трэцяй дзеі расказвае пра здраду Зігфрыда—гэта боль, адчай, безвыходнасць, страх перад будучыняй. І гэты цудоўны артыстызм спалучаецца з бліскучай тэхнікай. Менавіта гэтае непаўторнае спалучэнне, мне здаецца, найбольш за ўсё характэрна для Федзічавай.

Расказаць пра балет словамі немагчыма. Яго трэба бачыць і ўспрымаць самому, па-свойму. І калі танец прымушае вас задумацца, дык гэта вялікая заслуга выканаўцаў. Бачачы, як танцуюць Калерыя Федзічава і Юрый Салаўёў,—глядач думае. Думае пра цудоўнае і вялікае.

Б. ГЕРСТАН.

АГЛЯД САМАДЗЕЙНАСЦІ АЎТАЗАВОДЦАЎ

Тры дні ў Доме культуры Мінскага аўтазавода праходзіў агляд мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

У ім прынялі ўдзел 11 цэхаў і аддзелаў завода: калектывы Дома культуры. Прыемна, што ў аглядзе ўдзельнічалі новыя харавыя калектывы, створаныя ў цэхах прадпрыемства. Добрых вынікаў дабіўся хор цэха задніх мастоў (кіраўнік І. Перэльман). У яго рэпертуары «Сын вялікай партыі» В. Мурадэлі, «Дарога» Ю. Семянякі, беларуская народная песня «Кацілася чорна галка» ў апрацоўцы М. Корсака і «Вясновыя кветкі» І. Брамса.

З цікавай канцэртнай праграмай выступілі хор і агітбрыгада цэха лесавозаў. Вострую, надзённую мініяцюру «Да нас едзе Халадзецкі», створаную ў калектыве, цёпла сустрэлі гледачы. Вакальны ансамбль аддзела галоўнага тэхнолага выканаў беларускую народную песню «Ой, хацела ж мяне маці...», «Нарачанскія сосны» Петрашкевіча і «Асенні сон» Джойса.

З вялікімі канцэртнымі праграмамі выступілі таксама мужчынскі хор інтэрната № 1, хор рускай народнай песні, аркестр народных інструментаў і іншыя калектывы. Народны тэатр падрыхтаваў спектакль па п'есе К. Губарэвіча «Першы ўрок». Танцавальны калектыў паказаў харэаграфічныя малюнкі «Лен, мой лён» і «У новых чаравічках».

А ў фае Дома культуры паказваюць свае лепшыя работы заводскія фотааматары, самадзейныя мастакі і скульптары. Увагу наведвальнікаў выстаўкі прыцягваюць фотанарыс «Мы не забудзем тых, хто загінуў за Радзіму» Х. Грыгор'ева, скульптурныя партрэты «Рыхард Зорге», «Мікалай Гастэла» і «Дыпломніца» К. Гелашвілі, жывапісныя і графічныя работы І. Спірыдонава, А. Ананіча, І. Казекі, І. Еўдакімава і іншых.

Аргкамітэт і журы агляду рэкамендавалі лепшыя калектывы, асобных выканаўцаў, фотаработы і творы самадзейных мастакоў і скульптараў на раённы агляд.

В. БАРЫСЕВІЧ.

ВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ

У Дубровенскім раёне праводзіцца грамадскі паход-эстафета «Ад помніка да помніка».

Мэта паходу — праверыць, у якім стане знаходзяцца помнікі гісторыі і культуры, добраўпарадкаваць іх.

У час паходу-эстафеты да помнікаў воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адбываюцца выступленні ветэранаў вайны, былых партызанаў, пагранічнікаў, іх родных, блізкіх і сяброў.

У паходзе ўдзельнічаюць члены добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, камсамольскія і прафсаюзныя актывісты, ветэраны вайны, работнікі культурна-асветных устаноў, чырвоныя следапыты. Старт паходу адбыўся ў трох населеных пунктах раёна — у цэнтральным пасёлку торфапрадпрыемства «Асінторф», вёсках Бохана і Баброва.

І. КОГАН,
супрацоўнік Дубровенскай раённай газеты.

ТЭАТР

ПА ЗАПАЗЫЧАНАЙ КАНЦЭПЦЫІ

СПЕКТАКЛЬ ГОМЕЛЬСКАГА АБЛАСНОГА ТЭАТРА «НА УСЯКАГА МУДРАЦА ХАПАЕ ПРАСТАТЫ»

НА ПЯРЭДНІМ плане, ля партала стаіць бялявы малады чалавек, перад ім чарадой праходзяць розныя персанажы, і малады чалавек кожнаму з іх дае нешта накшталт кароткай характарыстыкі, як бы прыцэльваецца да іх, каб прыцэліўшыся, біць далей без промаху, напэўна. Так пачынаецца спектакль па п'есе А. Астроўскага «На ўсякага мудраца хапае прастаты» ў Гомельскім абласным драматычным тэатры.

Ужо загадзя, да спектакля, мы ведаем з афішы, што спектакль мае і іншую назву: «Запіскі падлюгі, якія ён сам напісаў». Такога падзагалоўка, як вядома, у Астроўскага няма. Але аматары сцэнічнага мастацтва ведаюць, што яшчэ некалькі гадоў назад выдатны савецкі рэжысёр Г. Таўстаногаў паставіў гэтую п'есу ў тэатры «Вспулчэсны» ў Варшаве пад назвай «Запіскі падлюгі, уласнаручна ім напісаныя». Мы ведаем, што Таўстаногаў выкарыстаў для свайго загалоўка словы галоўнага героя Глумава, выказаныя ім у парыве самабічавання, што назва гэтая ўзнікла ў варшаўскім спектаклі невыпадкова, што яна лагічна выцякала з усёй рэжысёрскай канцэпцыі. Таўстаногаў хацеў падкрэсліць, што яго перш за ўсё цікавіць лёс падлюгі, які рабіў свае цёмныя справы. Вось што піша аб гэтым спектаклі польскі журналіст Анджэй Уладыслаў Краль: «Дзённік падлюгі» на сцэне тэатра «Вспулчэсны» — гэта сатырычная камедыя, вельмі смешная і адначасова выкрываючая ўсю небяспеку кар'ерызму, які трымаецца на падхалімстве, ашуканстве, ліслівасці, на маланкавай змене масак... у залежнасці ад таго, з кім маеш справу».

Дык вось, спектакль пра падлюгу. Сапраўдным аб'ектам сатырычнай атакі ў спектаклі Таўстаногава стаў Глумаў, астатнія персанажы, якіх Глумаў ашуквае, паслугамі якіх ён карыстаецца, наўмысна былі пазбаўлены вострасатырычных фарбаў, характарыстыкі іх былі змякчаны. Гэта ў Варшаве. Гэта ў Таўстаногава.

У Гомелі рэжысёры Ул. Караткевіч і Ю. Арынянскі вырашылі паставіць спектакль Астроўскага, відаць, уражаныя канцэпцыяй Таўстаногава: бо невыпадкова тая ж цытата з п'есы аказалася ў яе загалоўку, невыпадкова ў спектаклі з'явіўся пралог, які я ўпамянуў у пачатку артыкула.

Як жа вырашаецца спектакль, наколькі правамернай і доказнай аказалася выбраная рэжысёрам пазіцыя?

Неабходна адразу сказаць, што спектакль глядзіцца з цікавасцю, дзеянне ў ім развіваецца даволі імкліва. Але, вырашыўшы камедыю ў 5 актах сыграць па-сучаснаму ў двух частках, рэжысура задала мастаку М. Гафту даволі-такі галаваломную задачу—у спектаклі з калейдаскапічнай стракатасцю мяняюцца карціны, і, каб захаваць зададзены рытм, мастаку давялося адмовіцца ад падрабязнай характарыстыкі месца дзеяння, абмежаваўшыся асобнымі, зусім неабходнымі і выразнымі дэталямі. Замест канкрэтных павільёнаў—сукны, гарадская агарожа, максімальнае выкарыстанне авансцэны, адсутнасць вельмі неабходных у п'есе Астроўскага бытавых характэрных падрабязнасцей.

Імкнучыся захаваць няспыннасць сцэнічнага дзеяння, рэжысура дапускае іншы раз і прыкрыя пралікі, сэнсавыя недакладнасці. Так, у Астроўскага сцэна Турусінай і Круціцкага набывае пікантную камічную афарбоўку, таму што перад гэтым ідзе сцэна, дзе Турусіна вымушана прызнацца сваёй пляменніцы Машаньцы, што яна далёка не заўсёды была такой набожнай, як зараз. Пераставіўшы гэтыя сцэны, рэжысёры пазбавілі акцёраў цікавых унутраных ходаў для больш поўнага раскрыцця характараў сваіх герояў. Камізм сітуацыі знікае. Некаторыя сцэны, вынесеныя з кампактнай абстаноўкі на вулічную прастору, глядзяцца і слухаюцца з цяжкасцю толькі таму, што па характары сваім яны «дамашнія», інтымныя.

Глумава ў спектаклі іграе малады артыст В. Ткачэнка, іграе — калі можна сказаць, на «сучаснай мове» — напорыста, «з агеньчыкам». Іграе ў добрым рытме, у вострым, часам гратэскавым ключы. Іграе злосна, нікольні не імкнучыся выклікаць да сябе спагаду глядзельнай залы, увесь час нібы гаворачы гледачам: «Бойцеся такіх прайдзісветаў!»

Есць у спектаклі такая сцэна: у сваёй усёпаглынальнай любві, жадаючы ўбачыць Мамаеву, Глумаў—Ткачэнка, як бы скінуўшы з сябе прывычную боязь, паралізуе Мамаеву патокам страсці, праследуе па ўсім пакоі, а потым, дайшоўшы да самазабыцця, рабалепна расцягнуўшыся на падлозе, шалёна цалуе маснічыну, якой дакраналіся яе ногі. Тут, як ні ў якой іншай сцэне, раскрываецца характар Глумава, які цудоўна ўмее акцёрствацаць, імгненна пераўвасабляцца, мяняць маскі па ходу ігры. І наогул узаемаадносіны Глумава з цёткай Мамаевай даволі дакладныя, разнастайныя і цікавыя. На мой погляд, артыст правільна намячае адносіны свае з дзядзькам Мамаевым, правільна ўгадвае яго слабыя бакі і беспамылкова на іх іграе. Тут і ліслівасць, і імкненне прынізіць сябе, здавацца ў вачах дзядзькі дурненькім чалавекам, які мае вострую патрэбу ў яго, дзядзькавых, мудрых парадах. І, наадварот, маска незалежна мыслячага вольнадумца ў абыходжанні з Гарадуліным. Гэта значыць, якраз тое, на што той абавязкова павінен быў клюнуць. Бо ўся Масква і перш за ўсё ён сам, Іван Іванавіч Гарадулін, лічыць сябе адчайным «лібералам»!

Мне здаецца, В. Ткачэнку неабходна больш старанна прадумаць адносіны свайго Глумава з Круціцкім і Турусінай. Наўрад ці яны грунтуюцца толькі на прыніжанасці і нізкапаклонстве. Бо Круціцкі — генерал, ваенная костачка, а, значыць, апрача падхалімства, любіць, відаць у маладых людзях яшчэ і салдацкую дысцыпліну, і кароткія адказы, і ваенную выпраўку, і дакладнасць гадзіннікавага механізма і г. д. Ва ўзаемаадносінах з Турусінай, відаць, перш за ўсё неабходна ўлічыць яе бязмежную забабонасць, як рэлігійна-ханжаскую істоту. Менавіта па шляху дакладных, гранічна выверaных узаемаадносін з усімі дзеючымі асобамі, па шляху імгненнай, беспамылковай змены масак павінен пайсці ў далейшай сваёй рабоце над вобразам малады, несумненна здольны артыст. Бо ў кішэні ў Глумава павінен быць поўны набор ключоў да душы кожнага з гэтых неабходных яму для кар'еры людзей.

Разнастайную галерэю характараў ствараюць у спектаклі прадстаўнікі старэйшага і сярэдняга акцёрскіх пакаленняў; яны складаюць роўны, добры аркестр, дзе кожны дакладна іграе сваю партыю. Мякка, смешна, з добрым пачуццём меры іграе Мамаева артыст Б. Сокалаў. Далёка не бяскрыўдная, а нават злосная і помслівая Мамаева ў выкананні артысткі А. Каменскай. Гэты характар у нечым істотным набліжаецца да таго завостранага малюнка, які намячае В. Ткачэнка ў Глумаве. З самага пачатку Мамаева — Каменская выглядае далёка не такой пакорлівай, крыху сумуючай, крыху дзівакаватай барыняй, як часта іграюць яе ў тэатрах. Таму і выкраданне дзённіка і іншыя подласці такой Мамаевай успрымаюцца як натуральная і лагічная праява характару.

Малы тэатр стварыў класічную традыцыю выканання ролі пустапарожняга Гарадуліна, які няспынна рагоча. Мне здаецца, што акцёр А. Каменскі блізкі якраз да гэтай трактоўкі вобраза. Яго Гарадулін і смешны, і смяшлівы, і пусты, і начыста пазбаўлены прынцыпаў.

Есць пэўнае рэжысёрскае сваволыства ў тым, што роля Манефы, цёмнай, хітрай, рыхлай і дурнаватай бабы, якая жыве за кошт ашуканства забабонных людзей, даручана мужчыну — артысту А. Яцкевіч. Гэта і смешна, і зусім праўдападобна. Блізкая да свайго сыночка, пранырлівая, гатовая на любыя прыніжэнні і дробныя подласці матухна Глумава. Яна, як мыш, здольная нячутна з'яўляцца і непрыкметна знікаць. У Глумавай, як яе іграе артыстка Н. Карнеева, няма нічога свайго — ні волі, ні жаданняў, ні, нават, здаецца, свайго аблічча — яна толькі цень свайго Жоржа.

Адным з галоўных персанажаў камедыі з'яўляецца «вельмі важны пан» Круціцкі. У нечакана-зайздроснай кар'еры Глумава гэты стары займае асобае месца. Яго слова на карысць Глумава мае рашаючае значэнне пры сватанні пляменніцы Турусінай, менавіта яго імкнецца Глумаў мець «пасаджаным бацькам», менавіта ад яго Глумаў гатовы бясконца цярпець прыніжэнні, працуючы над яго бяздарным, недарэчным і архірэакцыйным «праектам», менавіта да яго Глумаў асабліва беспардонна падлізваецца, а потым у фінале, будучы выкрытым, Глумаў менавіта на яго выліваe большую частку сваёй злосці. Круціцкі ў выкананні артыста А. Каплана — фанфарон, дурны, напышлівы і смешны. Для абмалёўкі характару артыст, як і большасць выканаўцаў у гэтым спектаклі, карыстаецца мяккімі, акварэльнымі фарбамі, карыстаецца ўмела, прафесіянальна і тактоўна. Але ж Круціцкі ў Астроўскага не толькі смешны ў сваіх філасофскіх і літаратурных патугах — ён яшчэ і небяспечны, небяспечны, як усякі рэтраград і рэакцыянер. Бо ён намераны змагацца сваім «пражэктам» з усім новым, што ўрываецца ў жыццё, ён выступае супраць рэформ наогул.

Мне здаецца, вобраз Круціцкага стаў бы куды больш аб'ёмным, значным і абагуленым, калі б асаблівую ўвагу звярнуў артыст на сацыяльную небяспеку вось такіх Круціцкіх. Між іншым, гэта заўвага адносіцца ў большай ці меншай ступені да ўсіх выканаўцаў роляў з акружэння Глумава.

І справа тут, відаць, не ў акцёрах, а ў рэжысёрскай задуме, таму што і названыя мною выканаўцы, і артысты А. Валодзіна (Турусіна), Л. Усанава (Машанька), Л. Краст (Курчаеў), В. Навуменка (Галутвіна) творча сумленна выконваюць гэтую задуму. Імкнучыся апраўдаць таўстаногаўскую канцэпцыю п'есы, рэжысёры Ул. Караткевіч і Ю. Арынянскі прытушылі, змякчылі характарыстыкі персанажаў, сярод якіх дзейнічае Глумаў. Відаць, змякчылі, адвялі іх у цень для таго, каб буйным планам выдзеліць небяспечную фігуру кар'ерыста і прыстасаванца. І, як мне здаецца, дапусцілі пралік. Глумаў з'яўляецца тыповым асколкам гэтага грамадства. Ен вучыўся подласці, прыстасавальніцтву, нахабнасці і іншым агіднасцям у кожнага з прадстаўнікоў гэтага грамадства. Глумаў дакладна ведае, што іншага шляху дасягнуць вышэйшых прыступак у грамадстве гэтым няма. Сумленнасць, прыстойнасць тут не ў модзе, розум нічога не варты, калі ён не абапіраецца на багацце і становішча. І абурылася гэтае грамадства толькі таму, што Глумаў у сваім дзённіку дазволіў сабе пераступіць мяжу, за якой пачынаецца праўда. І невыпадкова ў фінале Круціцкі, выказваючы агульную думку, што Глумаў усё-такі чалавек іх грамадства, гаворыць: «Я мяркую, праз некаторы час можна яго зноў прылашчыць».

І, можна не сумнявацца, прылашчаць.

Ю. СІДАРАЎ,
заслужаны артыст БССР.

СПЯВАЕ ГАЛІНА ВІШНЕЎСКАЯ

АКАДЭМІК АСАФ'ЕЎ выказаў аднойчы думку: у оперы Чайкоўскага «Яўгеній Анегін» вобраз Таццяны займае такое значнае месца, кампазітар напісаў для ўвасаблення гэтага вобраза такую пранікнёную музыку, аддаў Таццяне так многа высокага творчага натхнення, што твор гэты трэба было б назваць «Таццяна Ларына». Палемічнае выказванне вучонага атрымала яркае пацвярджэнне ў фестывальным паказе спектакля Акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР з удзелам салісткі Вялікага тэатра СССР народнай артысткі СССР Галіны Вішнеўскай.

Справа не толькі ў тым, што праслаўленая артыстка была нашай госцяй, і публіка, якая прыйшла ў тэатр «на Вішнеўскую», аддала ёй усе свае сімпатыі. Галіна Вішнеўская — цяпер адна з буйнейшых оперных артыстак свету — сілай свайго яркага таленту сапраўды зрабіла вобраз Таццяны ў справаздачным спектаклі цэнтральным.

Гэта была першая з партый, якія сыграла Вішнеўская на сцэне Маскоўскага Вялікага тэатра. Пасля Таццяны былі Леанора ў оперы Бетховена «Фідэліо», Ліза ў «Пікавай даме» Чайкоўскага, Аіда і Чыо-Чыо-сан ў аднайменных операх Вердзі і Пучыні, Катарына ў камічнай оперы Шабаліна «Утаймаванне непакорнай».

Пры ўсёй гэтай разнастайнасці асноўнае месца ў рэпертуары Вішнеўскай займаюць ролі драматычнага плана. Аіда — адно з вышэйшых дасягненняў артысткі.

І ўсё ж вобраз Таццяны Ларынай, дзе на першым плане не драматычныя рысы, а псіхалагічная глыбіня, шчырасць пачуццяў, душэўная чысціня, высакароднасць характару, застаецца адным з самых дасканалых у галерэі жаночых вобразаў, увасобленых Вішнеўскай на опернай сцэне.

У трактоўцы вобраза Таццяны Г. Вішнеўская вельмі чула прытрымліваецца музыкі Чайкоўскага і таго, як сам кампазітар ахарактарызаваў у адным з пісьмаў сутнасць характару сваёй гераіні: «Таццяна — поўная чыстай жаночай прыгожасці дзявочая душа, яшчэ не кранутая дотыкам да сапраўднага жыцця; гэта легуценная натура, якая смутна шукае ідэал і страсна ганяецца за ім. Не бачачы нічога падобнага да ідэала, яна застаецца незадаволенай, але спакойнай. Але варта было з'явіцца чалавеку, які знешнім выглядам вылучаецца з асяроддзя пошлаправінцыяльнага, як яна ўявіла, што гэта — ідэал, і страсць ахапіла яе да самазабыцця. Пушкін цудоўна, геніяльна паказаў магутнасць гэтай дзявочай душы, і я з самых ранніх гадоў маіх заўсёды бываў узрушаны да глыбіні душы глыбокай паэтычнасцю Таццяны пасля з'яўлення Анегіна».

Мы ўбачылі на сцэне якраз такую Таццяну. У першай карціне яна сціплая, стрыманая, нават баязлівая. Але вось другая карціна—сцэна з няńькай, сцэна пісьма. Палкія і складаныя пачуцці авалодалі Таццянай. У выкананні Вішнеўскай гэта карціна — сапраўдны шэдэўр опернага выканаўчага майстэрства.

Голас артысткі — яркае і моцнае сапрана чыстага і высокаароднага тэмбру, валодае яна сваім голасам свабодна, выкарыстоўваючы найбагацейшы арсенал вакальных сродкаў. Вішнеўская вельмі музычная. Хочацца адзначыць такую дэталь: артыстка нібы і не глядзіць на дырыжорскую палачку, яна спявае ў на дзіва гарманічным ансамблі з аркестрам і партнёрамі. А сцэнічная ігра артысткі была сапраўды на ўзроўні добрага драматычнага спектакля. Здзівіла нейкая асаблівая мяккасць і натуральнасць ігры, тонкая і выразная міміка, нават ігра вачэй, што на опернай сцэне рэдка сустрэнеш.

Такой жа выразнай і прывабнай была артыстка і ў астатніх сцэнах.

Выступленне Галіны Вішнеўскай у ролі Таццяны Ларынай — адна з незабыўных падзей Усесаюзнага фестывалю майстроў опернага і балетнага мастацтва.

Д. АВЕРКІЕЎ.

За граніцай жыве шмат нашых суайчыннікаў. Адны з іх пакінулі Радзіму ў пошуках кавалка хлеба яшчэ да рэвалюцыі, другія вывезены кайзераўцамі і гітлераўцамі ў часе першай і другой сусветных войнаў, трэція эмігравалі, калі заходнія вобласці Беларусі былі акупіраваны белапалякамі, чацвёртыя, спалохаўшыся кары за зробленыя злачынствы, у абозе ворагаў пайшлі туды самі. Сярод апошніх такія здрадніці, як Астроўскі, Абрамчык, Кушаль, Рагуля, Станкевіч і іншыя адшчапенцы. Знайшоўшы сабе новых гаспадароў, яны праводзяць сярод суайчыннікаў ганебную работу, дэзінфармуюць іх, запалохваюць, уцягваюць у замежныя разведкі. Аднак большасць нашых суайчыннікаў не забываюць сваёй Радзімы, з'яўляюцца яе патрыётамі, радуюцца нашым поспехам.

Аб усім гэтым —мой новы раман «Радзіма». Прапаную ўвазе чытачоў урывак з яго.

АЎТАР.

З кожным днём у лагерах перамешчаных асоб усё цяжэй станавілася дыхаць. Пастаяннай работы ў акупіраванай Германіі знайсці было цяжка. Вырвацца на радзіму тым, якія гэтага прагнулі, не ўдавалася. Савецкіх прадстаўнікоў, знаходзячы розныя прычыны, у лагеры не пускалі. Затое з баракаў не вылазілі вярбоўшчыкі розных краін, каб дастаць танную рабочую сілу. Асабліва надакучалі наймітыі замежных разведак, буржуазныя нацыяналісты, упаўнаважаныя як БЦР, так і БНР, а ў апошні час яшчэ так званага «БАЗА» (Беларуска-амерыканскае аб'яднанне)—фашысцка-нацыяналістычнай арганізацыі, якую ўзначальваў Мярляк, у мінулым таксама актыўны памагаты гітлераўцаў. Галоўнае ўпраўленне «БАЗА» знаходзілася ў Нью-Йорку. Усе гэтыя здрадніці, каб выслужыцца перад сваімі заступнікамі, апраўдаць сродкі, якія ім выдавалі, наперабой імкнуліся прымусіць суайчыннікаў запісацца ці то ў замежны легіён, ці ў разведку, ці хоць бы ў нацыяналістычную арганізацыю. І толькі вечарамі перамешчаныя асобы, астаўшыся адны (у грамадзе заўсёды знойдзецца і дасціпны, і востры на язык, і апавядальнік, і музыка), разганялі тугу, як свежы вецер разганяе дым і імглу.

— Мусіць, лепш за ўсё падацца за акіян,—разважаў уголас Шыманскі.—Вельмі ж сёння расхвальваў вярбоўшчык «амерыканскі лад жыцця».

Шыманскі сумысле завёў гаворку, як на гэта паглядзіць Рокаш, бывалы чалавек: быў на кані і пад канём.

— Расхвальваў?—перапытаў Рокаш.—На прапаганду амерыканцы грошай не шкадуюць. А сапраўднасць там зусім іншая.

— А што вам вядома пра ЗША?

— Многае.

— Раскажыце.

Каля іх збіраўся натоўп, усім хацелася паслухаць пра жыццё ў «свабоднай» Амерыцы.

— Мой сябра, таксама як і я, атручаны нацыяналізмам, у канцы васемнаццатага года ў абозе кайзераўскіх войск пасунуўся на захад. Я астаўся ў Германіі, а ён паехаў у Амерыку. Мы з ім, за выключэннем другой сусветнай вайны, увесь час перапісваліся. Цяпер зноў аднавілі сувязь.—Рокаш паказаў даўжэзнае пісьмо.—Між іншым, сябра нападамляе, што ён больш не ў сілах цярпець «амерыканскі рай», напісаў савецкаму паслу ў Вашынгтоне пакаянную заяву, што гатоў панесці любую кару за зробленую ў маладосці памылку, а толькі каб яму дазволілі вярнуцца на радзіму. І што вы думаеце, пасол адказаў?—Рокаш перагарнуў некалькі старонак пісьма і прачытаў:—«Пакаянная галава меч не сячэ». Абяцаў яму выдаць візу на ўезд у Савецкі Саюз.

— Казка для дзяцей,—скрывіўся Станіслаў.—Вярніся толькі, павесяць на першым слупе.

— Відаць, вы шмат чаго натварылі, што гэтак баіцеся,—заўважыў Рокаш.

— Лепей ужо дзе-небудзь у джунглях скласці галаву,—працягваў Станіслаў.

— Дурную галаву з плячэй далоў,—усміхнуўся Кулік.

— Пустазелле з поля вон!—падтрымаў Кунцэвіч.

— Но-но!—прыгразіў Станіслаў.— Пагавары ў мяне—дух вон!

— Тонкая кішка! — заступіўся Дзегцяр.

— Дайце гаварыць!—пачуліся галасы.

— Добра жывецца ў Амерыцы шасцідзесяці сем'ям, якія накіроўваюць палітычнае і эканамічнае жыццё краіны,—заглядаў у пісьмо Рокаш.—У руках гэтых сем'яў сканцэнтраваны прыродныя багацці, магнаты з'яўляюцца ўладальнікамі велізарных прамысловых прадпрыемстваў, друку і радыё, страхавымі і пароходнымі кампаніямі. Яны кантралююць праз сваіх прадстаўнікоў кангрэс і прэзідэнта ЗША. Большасць з іх звязаны між сабою сваяцтвам або ўкладзеным у прадпрыемствы капіталам. Яны не займаюць высокіх пасад і нібы трымаюцца ў ценю. Але ўсе ключавыя пазіцыі знаходзяцца ў руках магнатаў і бяда таму, хто асмеліцца не палічыцца з імі. Сатруць у парашок.

— А што такое Уол-Стрыт?—пацікавіўся Кунцэвіч.

— Аперацыйная база фінансавых магнатаў,—адказаў Рокаш.—Уол-Стрыт дае дырэктывы—якія законы можна прыняць, а якія нельга. І нават вырашае, быць ці не быць вайне. Вось хто заканадаўца. Так выглядае дэмакратыя па-амерыканску.

— Дальбог, ён не з пісьма гэта бярэ, а з галавы,—усумніўся Станіслаў.

СЛОВА БЯРЭ ЧЫТАЧ

Слова чытача... Як дорага яно пісьменніку! Колькі прыносіць радасці, хвалявання, а часам і ніякаватасці, хай сабе чытацкія думкі бываюць няскладна, шурпата выказаны, хай сабе не супадаюць іншы раз з ацэнкай, дадзенай твору прафесіянальнай крытыкай.

Водгукі чытачоў прыходзяць і ў адрас саміх аўтараў, і ў адрас газет і часопісаў, і ў выдавецтвы.

Друкуем частку тых, што прыйшлі апошнім часам у рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва».

СУСТРЭЧА БУДЗЕ КАРЫСНАЯ

Настаўнік, які хоча расказаць вучням пра сённяшні дзень нашай літаратуры, адчувае патрэбу ў дапаможніках, якія былі б набліжаны да задач школьнага курса літаратуры і ўмоў выкладання. Пакуль што, на жаль, у нас няшмат літаратуразнаўчых і крытычных кніг, якія б адпавядалі гэтым умовам. І вось выдавецтва «Народная асвета» выпусціла зборнік артыкулаў А. Лойкі «Сустрэчы з днём сённяшнім». Гэта кніга, безумоўна, прыцягне ўвагу настаўнікаў літаратуры.

У кнізе А. Лойкі гаворыцца пра сённяшні дзень беларускай паэзіі, пра лепшыя здабыткі апошняга дзесяцігоддзя, пра літаратурнае папаўненне, якое прыйшло ў беларускую літаратуру ў апошнія гады. Аўтар імкнецца вызначыць асноўныя заканамернасці і тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай паэзіі, прасачыць кірункі яе пошукаў, паказаць месца ў сучасным літаратурным працэсе найбольш значных новых твораў нашых паэтаў.

Кніга складаецца з асобных артыкулаў, многія з якіх мы памятаем па перыядычным друку. Пісаліся яны з рознай нагоды, але кніга выглядае цэласнай — артыкулы, за рэдкімі выключэннямі, зліваюцца ў адно агульнае даследаванне сучаснай паэзіі. А. Лойка скіроўвае ўвагу, галоўным чынам, на раскрыццё мастацкай індывідуальнасці таленту. Ён, мы б сказалі, з асаблівай пашанай ставіцца да аўтара і настолькі радуецца кожнай праяве самабытнасці ў паэзіі, што часам (у раздзеле «Папаўненне») «перахвальвае» некаторыя кнігі і асобныя творы.

Аналізуючы сучасную беларускую паэзію, аўтар перш-наперш спыняецца на творах, без якіх сёння цяжка ўявіць школьны курс літаратуры. Шмат старонак кнігі аддадзена, напрыклад, паэме П. Броўкі «Голас сэрца» і вершу М. Танка «Ave Maria». Дарэчы, менавіта гэтыя старонкі здаюцца мне лепшымі ў кнізе. Яны прываблі-ваюць і ўсхваляванасцю гаворкі, і тонкасцю аналізу, і яркай адметнасцю, калі можна так сказаць, форм зносін крытыка з творамі паэзіі: паэма «Голас сэрца» разглядаецца ў эмацыянальна - публіцыстычным плане, верш «Ave Maria» стаў аб'ектам для літаратуразнаўча-крытычнага эсэ.

Гэтыя старонкі—добры ўзор таго, як трэба расказваць пра паэзію: па-рознаму—у залежнасці ад аб'екта гаворкі, змястоўна, пранікаючы ў глыб твора, проста і даходліва.

Артыкул «У славу Кастрычніка» прысвечаны сучаснай паэме. На жаль, з твораў апошняга часу аўтар спыніўся толькі на паэме А. Русецкага «Яго Вялікасць», задаволіўшыся ў дачынненні да іншых твораў гэтага жанру пералікам. Хацелася б знайсці ў артыкуле больш глыбокую гаворку пра сённяшнія праблемы жанру, пра прычыны лірызацыі паэмы, пра яе месца і ролю ў сучасным літаратурным працэсе.

Асобныя артыкулы ў кнізе прысвечаны творчасці У. Дубоўкі, К. Кірэенкі, М. Аўрамчыка, С. Дзяргая. Гэтыя артыкулы набліжаюцца да творчых партрэтаў. Зноў жа — яны добра кладуцца побач з школьным падручнікам: імёны паэтаў, вядомы вучням па чытанках і хрэстаматыях, згадваюцца яны і ў падручніках.

Емісты і цікавы раздзел «Папаўненне». Тут А. Лойка гаворыць аб паэтах, якія прыйшлі ў літаратуру ў апошняе дзесяцігоддзе. Прадмет гаворкі надзвычай шырокі. Тым не менш А. Лойка ў пераважнай большасці выпадкаў здолеў і паказаць асаблівасці таленту многіх маладых паэтаў (Р. Барадуліна, У. Караткевіча, А. Наўроцкага, А. Вярцінскага), і змястоўна расказаць пра многія кніжкі, часам нават прасачыць, як раслі і творча дужэлі маладыя паэты. Даволі прыкметны недахоп гэтага артыкула — фрагментарнасць. Нататкі пра асобных паэтаў слаба звязаны між сабою, і гэта замінае ўбачыць і асэнсаваць тое агульнае, што яднае паэтаў гэтага пакалення.

У кнізе ёсць спробы прадвызначыць шляхі далейшага развіцця нашай паэзіі. Разважанні А. Лойкі пра перспектывы асацыятыўнай вобразнасці, пра магчымасці верлібра здаюцца мне цікавымі і слушнымі, аднак недастаткова звязанымі з агульнымі пытаннямі развіцця сучаснай паэзіі, такімі, як паглыбленне праблемнасці, гістарызм мыслення, барацьба супроць інфляцыі вобразнасці ў сувязі з ростам версіфікацыйнага ўмельства і г. д.

Агульная ж каштоўнасць гэтай кнігі А. Лойкі для мяне бясспрэчная. Несумненна, настаўнікі літаратуры ахвотна будуць карыстацца ёю.

М. ЦІХАНЧУК,
настаўнік.

ПРА ВІЦЕБСКІХ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

Чым далей ад нас суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны, тым больш дарагім становіцца нам кожнае слова аб усенародным змаганні, тым больш удзячныя мы за кожную новую старонку гэтага змагання, прыгаданую ўдзельнікамі падзей або адноўленую пісьменнікамі-дакументалістамі.

Пра подзвігі адважных герояў Мінскага падполля мы даведаліся з кніг І. Новікава «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» і «Руіны страляюць ва ўпор».

Падпольшчыкам Віцебска прысвечана новая аповесць І. Новікава «Тварам да небяспекі», надрукаваная ў «Полымі» ў канцы мінулага года (№№ 10—12).

«У Віцебску ў час вайны актыўна дзейнічала шмат падпольных груп. Яны гераічна змагаліся з ворагам. Паказаць дзейнасць усіх груп у адной кнізе, бадай, немагчыма, — на маю думку, кожная група заслугоўвае сваёй кнігі. Мусіць, тады і будзе напісана гісторыя Віцебскага падполля. Я ж ставіў перад сабой задачу прасачыць на прыкладзе адной дыверсійна-разведвальнай групы, як паводзілі сябе мае равеснікі, калі над Радзімай навісла смяротная небяспека», — гаворыць аўтар у прадмове.

У аснову аповесці «Тварам да небяспекі» ляглі дакументальныя матэрыялы, а таксама вусныя і пісьмовыя ўспаміны людзей дыверсійна-разведвальнай групы Міколы Нагібава, які з'яўляецца галоўным героем кнігі.

Новая кніга І. Новікава расказала нам пра мужных людзей, якія ў самых небяспечных умовах праявілі выдатную маральную і грамадзянскую загартоўку, адданасць Радзіме, гатоўнасць ахвяраваць жыццём за свабоду свайго народа.

Перад нашымі вачыма як жывыя паўстаюць героі-падпольшчыкі Мікола Нагібаў, яго жонка Таня, упаўнаважаны абкома Васіль Раманавіч, кіраўнікі груп Мехаў, Ляхоўскі, Смірноў і радавыя падпольшчыкі. І. Новікаў расказвае не толькі пра справы гэтых людзей, ён ярка і вобразна раскрывае характары падпольшчыкаў. Часам яму хапае некалькіх штрыхоў, каб стварыць запамінальны вобраз. Так, запамінаецца вобраз партызанкі Ванды, хоць пра яе і сказана ў аповесці няшмат, паказана толькі, як сустрэла яна смерць — мужна і высакародна.

Пісьменнік перадаў у творы атмасферу нялёгкай барацьбы, паказаў, як мужнелі і сталелі людзі ў час гэтай барацьбы. Мы атрымалі яшчэ адзін каштоўны расказ пра людзей, чыя гераічная дзейнасць пакінула значны след у гісторыі ўсенароднага змагання супраць фашызму.

І. СІЎЧАНКА,
пенсіянер.

У АДЗІНЫМ СТРАІ

Перагорнута апошняя старонка зборніка. Я не спяшаюся ставіць кніжку на паліцу, а зноў перачытваю некаторыя вершы...

У аўтара гэтай кнігі, былога студэнта Віцебскага ветэрынарнага інстытута Леаніда Рашкоўскага жыццё склалася нялёгка. Прыкаваны да ложка, хлопец не скарыўся лёсу: шмат чытаў, вучыўся (вучыцца і зараз завочна ў БДУ), настойліва шукаў сябе ў паэзіі.

І вось у выдавецтве «Беларусь» выйшла яго першая кніга «Няхай не паміраюць зоркі». Чытаючы гэту кнігу, мы знаёмімся з мужным і шчырым чалавекам, які горача любіць сваю Радзіму, родны край і, насуперак асабістым нягодам, імкнецца прымаць актыўны ўдзел у жыцці.

...Я хочу быть с друзьями
в едином строю,
Я хочу быть с Отчизной в труде
и борьбе,
И я делаю вызов судьбе
и себе, —

піша паэт у вершы «Маё крэда». У кніжцы мы знаходзім шмат сведчанняў таго, што паэт верны гэтаму свайму жаданню, што ён знаходзіць у сабе сілы быць у адзіным страі з камсамольцамі-будаўнікамі («Рамантыка», «Лірычны герой паэта»), з барацьбітамі за мір («Гаворыць зямля»), прымае да сэрца людскія трывогі і клопаты. Паэт гаворыць у адным з вершаў, што ён не можа маўчаць,

Если в нашем мире неспокойно
От в упор нацеленных мортир,
Если угрожают людям войны...

Чытаючы кнігу «Няхай не паміраюць зоркі», мы пераконваемся, што ў яе аўтара Леаніда Рашкоўскага сапраўды была ўнутраная патрэба сказаць сваё паэтычнае слова.

У. ЕРАМІНОК,
супрацоўнік Лунінецкай раённай газеты.

ЗНАЁМАЯ НЕЗНАЁМКА

У часопісе «Маладосць» (№ 1, 1968 г.) надрукавана аповесць Аляксея Карпюка «Знаёмы незнаёмец».

Галоўную гераіню сваёй аповесці Ірыну Станкевіч аўтар надзяліў прывабнымі рысамі. Яна прыгожая жанчына, верная жонка, пяшчотная маці, добрая настаўніца. Жывучы ў вузкім коле сямейных клопатаў, яна тым не менш не губляе цікавасці да ўсяго навакольнага свету. Нават дарога ў школу для яе зусім не будзённы шлях: Ірына кожны раз знаходзіць нешта новае, цікавае. Вясной, напрыклад, яна нецярпліва чакае, калі з набрынялых пупышак выклюнуць, нарэшце, «тоненькія свежыя стрэлачкі лісцікаў». Яе радуе тое, што сцены гасцініцы, якая будуецца побач, сёння ўзняліся вышэй.

А прахожыя? Многіх яна ўжо запомніла ў твар. Адны ёй падабаюцца, другія яе раздражняюць. Напрыклад, вось гэты, які «...ідзе важна, ні на каго не гляне, пасопвае і так трымае галаву, быццам з яе што-небудзь спадзе». Мабыць, бюракрат, заключае Ірына.

Ірына не разумее тых жонак і мужоў, якія «ў нядзелю панадзяваюць габардзінавыя палітоны, прыбяруць дзяцей, пабяруцца за рукі і пойдуць па людной вуліцы шпацыраваць». Летуценную Ірыну цягне больш у поле, у лес.

Муж Ірыны — малады вучоны, вельмі заняты навуковай працай. Ірына кахае свайго мужа і ганарыцца яго поспехамі. Аднак у яе адносінах з мужам усё часцей паяўляецца неспакой, незадаволенасць, асабліва тады, «калі яму пішацца, і ён адыходзіць... на цэлыя тыдні, месяцы і лунае ў іншым свеце». У такіх выпадках ёй хочацца кінуць мужу ў твар: «Эгаіст, толькі сябе і свае рукапісы бачыш!» Ёю нават авалодвае пачуццё помсты. Так, з нейкага часу ў патоку пракожых Ірына пачынае вылучаць маладога чалавека, які становіцца для яе «знаёмым незнаёмцам». «Ветлівы твар. Чыстыя вочы. Лёгкая хада спартсмена. Заўсёды акуратна апрануты. І наогул нейкі не такі, як іншыя» — з прыемнасцю адзначае Ірына і ўсё больш і больш углядаецца ў яго.

Гісторыя «адносін» са «знаёмым незнаёмцам» займае ў аповесці значнае месца. Перакідваючыся позіркамі з гэтым маладым чалавекам, Ірына як бы вяртае сабе тую частку ўвагі і цікаўнасці, што нестае ёй ад мужа. Але першая ж размова з «незнаёмцам» выкрывае ў ім звычайнага абывацеля. Ірына лёгка развітваецца са сваёй ілюзіяй, а гэта гісторыя — прама скажам, даволі банальная — паслужыла штуршком для шчырай размовы з мужам.

У аповесці нямала трапных дэталей, цікавых карцін, умела выхапленых з жыцця. Тым не менш, мы не можам пераслініць пачуццё незадаволенасці творам. Здаецца, пісьменнік яшчэ не ўсё сказаў пра сваю сімпатычную гераіню, штосьці істотнае ўпусціў, аб чымсьці істотным змоўчаў, і пры ўсёй сімпатыі да гераіні мы не захапляемся ёю.

Перш за ўсё, лёгкімі і не вельмі істотнымі здаюцца канфліктныя сітуацыі, у якія трапляе гераіня. Мабыць, гэта — ад таго, што выпрашаюцца яны лёгка і проста. Адразу і хутка наладжваюцца адносіны Ірыны з мужам, і ўсё, што тычылася «незнаёмца», аказваецца дробным непаразуменнем.

У непрыемную гісторыю трапіла Ірына ў школе — ударыла вучня. Настаўнікі ведаюць, што гэта «ЧП» для ўсёй школы і тым больш для самога педагога. «Здарылася непрыемнасць, пасля якой жыць не хочацца», — перажывае Ірына. Але аўтар абмінае, не паказвае яе перажыванні. І гэта шкодзіць аповесці, бо паводзіны Ірыны ў школе і спатканні з «незнаёмцам» маюць, несумненна, унутраную сувязь.

Увогуле, гераіня аповесці паказана, па сутнасці, толькі ў сферы сямейных адносін, а гэта відавочна збядняе вобраз, бо мімаходзь аўтар падказвае нам, што «службовае» жыццё гераіні, а таксама адносіны з суседзямі, знаёмымі — багатае на выпрабаванні. Паказваць гераіню па-за гэтымі выпрабаваннямі—значыць збядняць яе характар. Ірына сапраўды адпавядае ідэалу свайго мужа—мы таксама адзначаем у ёй «добразычлівасць і прывабнасць». Але гэтыя якасці яе не выяўляюцца ў сітуацыях, якія патрабуюць барацьбы і дзеяння.

Ды і дома, у сямейным коле, Ірына часам трымаецца так, што абрысы жывога чалавечага характару раптам трацяць канкрэтнасць, расплываюцца.

Е. ІВАНОВІЧ,
настаўнік.

З РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫСТАЎКІ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

Л. МЯГКОВА — дэсертны сервіз «Рускі» (шкло).



У. і М. БАСАЛЫГІ — «Прыгажуні» (дрэва).

В. ГАУРЫЛЮК — «Лялькі» (саломка).

У. ЖОХАЎ — «Чорт» (шкло).

ПАПЕРА НАШЫХ ПРОДКАЎ

Адна з найбольш «надзейных» крыніц пры вывучэнні гістарычнага мінулага беларускага народа — помнікі старажытнай пісьменнасці. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць для даследчыка пісьмовыя дакументы, пазначаныя месцам і часам іх напісання. Аднак пераважная большасць старабеларускіх помнікаў такіх звестак не мае. Не заўсёды можна даверыцца і паказанням датаваных кніг і дакументаў: вядомы выпадкі, калі помнік з пэўнай датай аказваўся не арыгіналам, а пазнейшай копіяй або падробкай. Таму аб арыгінальнасці той ці іншай пісьмовай крыніцы і аб часе яе ўзнікнення можна меркаваць толькі на аснове палеаграфічнага даследавання. І самым дакладным палеаграфічным сродкам датавання лічыцца датаванне па вадзяных знаках (або філіграмах).

Вадзяныя знакі на старой паперы прыцягвалі ўвагу даследчыкаў яшчэ на зары славянскай палеаграфіі. Што датычыць помнікаў старабеларускай пісьменнасці, то іх з пункту погляду філіграназнаўства да апошняга часу амаль не вывучалі зусім. Таму выклікае натуральную цікавасць выхад у свет першай сур'ёзнай працы такога тыпу — двухтомнага даследавання літоўскага палеографа Э. Лаўцявічуса «Папера ў Літве ў XV—XVIII стагоддзях» (выдавецтва «Мінціс», Вільнюс, 1967, на літоўскай мове).

Даследаванне гэта — вынік 25-гадовай працы яго аўтара. Яно грунтуецца на глыбокім вывучэнні шматлікіх пісьмовых дакументаў сярэдневяковага перыяду, якія зберагаюцца ў кнігасховішчах Вільнюса, Каўнаса, Масквы, Мінска, Ленінграда і Гродна, а таксама ў прыватных архівах. Асноўная мэта, якую ставіць Лаўцявічус перад сабой, — дапамагчы палеографам у вызначэнні дат тых рукапісаў і друкаваных кніг, што не маюць выходных дадзеных.

Першы том, прысвечаны гісторыі паперы ў Вялікім княстве Літоўскім, мае вялікае тэарэтыка-пазнавальнае значэнне. Ён складаецца з некалькіх раздзелаў, у якіх на багатым фактычным матэрыяле прасочваюцца асноўныя этапы развіцця папяровай прамысловасці на беларускіх і літоўскіх землях, характарызуюцца важнейшыя тэматычныя групы старажытных вадзяных знакаў, даюцца практычныя рэкамендацыі да іх выкарыстання пры датаванні дакументаў і кніг.

На аснове вывучэння шматлікіх прац рускіх і зарубежных папераведаў і каштоўных звестак, пачэрпнутых з разнастайных архіўных крыніц, Лаўцявічус дае падрабязны нарыс працэсу вытворчасці паперы ручным спосабам, пачынаючы ад падбору месца для папяровага млына і канчаючы выпускам гатовай прадукцыі.

Спецыяльны раздзел аб вадзяных знаках аўтар пачынае з іх агульнай характарыстыкі. Паходжанне вадзяных знакаў ён тлумачыць патрэбамі ўласнікаў папяровых прадпрыемстваў: філіграні з'яўляліся маркамі вытворчасці, па якіх адрозніваліся гатункі і фарматы паперы, вызначалася якасць работы майстроў. Кожны папяровы млын меў свае вадзяныя знакі, якія хутка змяняліся. Гэта дае магчымасць датаваць паперу ў прамежках невялікіх адрэзкаў часу.

Асабліва змястоўны раздзел аб гісторыі вытворчасці паперы ў Вялікім княстве Літоўскім. На аснове архіўных матэрыялаў Лаўцявічус паказвае, што, пачынаючы з XVI ст., тут дзейнічала ў розныя часы больш 40 папяровых прадпрыемстваў. 11 папяровых млыноў было пабудавана ў XVI—XVII стагоддзях каля адной толькі Вільні (тры з іх у канцы XVI ст. належалі Лукашу Мамонічу). На тэрыторыі сучаснай Беларусі папяровая вытворчасць была арганізавана ў старажытнасці ў Смаргоні, Гальшанах, Дзітве каля Ліды, Нясвіжы, Уздзе, Заслаўлі, а з XVIII ст.—у Паставах, маёнтку Котлава каля Навагрудка, маёнтку Калачы каля Вілейкі, маёнтках Камень і Мантавічы каля Ліды, Дзятлаве, Свіслачы і інш.

Характарызуючы папяровыя млыны літоўскай дзяржавы, аўтар не абмяжоўваецца іх знешняй гісторыяй, а паказвае, якія гатункі паперы выпускаліся ў кожным з іх, называе характэрныя для гэтай паперы вадзяныя знакі, характарызуе рабочы персанал прадпрыемстваў, аналізуе ўзаемаадносіны майстроў і чаляднікаў.

Далей на канкрэтных прыкладах даследчык паказвае, як вадзяныя знакі дапамагаюць вызначаць і ўдакладняць даты выхаду ў свет старажытных кніг і дакументаў. У прыватнасці, ён разглядае 9 вядомых у наш час экземпляраў славутага Літоўскага Статута 1588 г., датаванне якіх выклікала спрэчкі вучоных ад пачатку XIX ст. да нашага часу. На аснове вывучэння іх вадзяных знакаў, пры супастаўленні з філіграмямі помнікаў, год узнікнення якіх дакладна вядомы, аўтар прыходзіць да высновы, што час друкавання 3 экземпляраў Статута адпавядае даце, указанай на тытульных лістах (1588 г.). Астатнія ж 6 экземпляраў выйшлі з друкарні Мамонічаў у 1600 годзе.

Другі том даследавання Лаўцявічуса, значна большы па аб'ёме,— альбом вадзяных знакаў. Колькасць іх тут даходзіць да 4300. Усе яны перамаляваны з арыгіналаў алоўкам праз капіравальную паперу. Такі прынцып падачы вадзяных знакаў у гэтай працы, на нашу думку, з'яўляецца больш дакладным і практычна апраўданым, чым у вядомых нам альбомах іншых усходнеславянскіх філіграналогаў.

Істотная перавага альбома над многімі іншымі працамі гэтага тыпу і ў методыцы сістэматызацыі вадзяных знакаў. Аўтар групуе вадзяныя знакі тэматычна, што дазваляе лёгка адшукваць іх у альбоме. Акрамя таго, кожны знак забяспечаны парадкавым нумарам, указваюцца дата і месца напісання ці друкавання дакумента або кнігі, адкуль скапіраваны знак і месца іх захавання зараз. У асобным спісе прыводзяцца ў алфавітным ладку назвы вадзяных знакаў.

Даследаванне Лаўцявічуса не з'яўляецца, безумоўна, поўным зборам вадзяных знакаў на паперы, якая ўжывалася ў старажытны перыяд на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Не вызначаюцца паўнатой і звесткі аб старажытных папяровых млынах на тэрыторыі літоўскай дзяржавы XVI—XVIII стагоддзяў. Так, напрыклад, пры характарыстыцы папяровай прамысловасці на беларускіх землях аўтар амаль не называе млыноў для вырабу паперы ва ўсходняй частцы Беларусі (за выключэннем дубровенскага млына на Дняпры), хоць існаванне такіх млыноў у старажытнасці на Магілёўшчыне і Віцебшчыне можна лічыць зусім верагодным.

Але, безумоўна, даследаванне Э. Лаўцявічуса з'яўляецца каштоўным укладам у палеаграфічную навуку. Яно стане надзейным практычным дапаможнікам для літоўскіх і беларускіх палеографаў, для ўсіх, хто цікавіцца гістарычным і літаратурным мінулым нашых братніх народаў.

А. БУЛЫКА.

БІБЛІЯТЭКІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Бібліятэка Акадэміі навук БССР імя Якуба Коласа захоўвае ў сваіх фондах асабістыя бібліятэкі вядомых вучоных. Па розных адзнаках на кнігах можна прасачыць за работай вучоных.

У бібліятэцы, напрыклад, захоўваюцца кнігі вядомага беларускага этнографа Адама Багдановіча — бацькі паэта Максіма Багдановіча. Гэта яго другая асабістая бібліятэка (першая ў час пажару згарэла ў Яраслаўлі). У ёй шмат кніг пра Беларусь, выданні па гісторыі і літаратуры нашага народа, ну, і, зразумела, творы сына. У зборы кніг вучонага-літаратуразнаўцы І. Яроміна сабрана шмат літаратуры пра «Слова аб палку Ігаравым».

Нядаўна бібліятэка АН БССР набыла збор кніг і іншых матэрыялаў беларускага біёлага, акадэміка М. Таміна, які падаравала бібліятэцы жонка вучонага Г. Таміна. Гэты збор налічвае 1.300 экземпляраў кніг, адбіткаў артыкулаў па фауне і флоры Беларусі. У трынаццаці папках сабраны рукапісы вучонага, яго перапіска, фатаграфіі.

А. ФУРС.

— Ну і што з таго, значыць, варушыць галавою,—захапляўся Шыманскі.

— На, паглядзі,—тыцкнуў пальцам у пісьмо Рокаш.—Галава яловая!

— Чаго ж тады народ маўчыць?—спытаўся Дзегцяр.

— Народ не маўчыць, пратэстуе, але пакуль нічога не можа зрабіць,—гаварыў Рокаш.— Рэакцыйныя сілы, якія знаходзяцца на чале ўлады, валодаюць шмат якімі сродкамі, каб трымаць у падпарадкаванні рабочы клас і ўсё амерыканскае насельніцтва. Усюды ўрад мае сваіх людзей, якія сочаць за настроямі ў грамадскіх арганізацыях, у цэрквах, у прафсаюзах. Магнаты выкарыстоўваюць вялікія сумы на прапаганду, каб давесці, што Амерыка і амерыканцы ўсюды і заўсёды першыя. Вядзецца таксама прапаганда, што ўсе амерыканцы маюць магчымасць стаць фордамі і рокфелерамі. Патрабуецца толькі не складаючы рук працаваць. І не апошнюю ролю адыгрывае подкуп лідэраў прафсаюзаў. Ім добра плацяць. Таму яны зусім не клапоцяцца аб інтарэсах членаў прафсаюза.

— Што ні кажыце, а Амерыка багатая краіна,—не здаваўся Станіслаў.

— Багатая, але не для ўсіх,—працягваў Рокаш.—Адзін шалее з раскошы, другі кавалку хлеба жадзён.

— Бог лесу не зраўняў, не тое што людзей,— скуголіў Станіслаў.

— Ды замаўчы ты!—крыкнуў Шыманскі.—Курыная галава!

— Прадстаўнік Амерыкі расказваў, што ў іх працоўны чалавек усё можа купіць у растэрміноўку,—не ўнімаўся Станіслаў.

— Хітрая штука —іх крэдытная сістэма,— заўважыў Рокаш.—Але купіць можа толькі той чалавек, у каго ёсць работа. А не ўнясеш адзін раз у тэрмін за набытыя ў крэдыт рэчы—усё трацішь.

— Дык гэта ж ашуканства!—абураўся Кунцэвіч.

— Бізнесмены лічаць: не ашукаеш—не пражывеш; у свой час у старой Расіі так было,—паклаў пісьмо ў кішэню Рокаш.—Адным словам, раю, хто хоча жыць, вяртайцеся ў Савецкі Саюз.

— Савецкі Саюз—гэта краіна, у якую лёгка ўвайсці, але з якой цяжка выйсці,—устаў і пайшоў Станіслаў.

— Як каму!—кінуў наўздагон Рокаш.

Паволі разыходзіліся перамешчаныя асобы, поўныя дум: адны, як выратаваць шкуру, а другія, як выбрацца з няволі. У трызоніі заварушыліся неафашысты, якіх падкармлівалі англасаксы. Нават на вуліцах час ад часу можна было пачуць: «Калі мы зноў захопім Польшчу?», «Калі мы возьмем Чэхаславакію?». «Калі мы лінію Одэр-Нэйсе адсунем да Урала?». Усё гэта насярожвала чуллівыя душы людзей, якія па прымусу апынуліся на чужыне.

Каля нараў Кунцэвіча збіралася моладзь. Некалькі лагернікаў, як куры на седале, прымасціліся на вокнах. Юнакі жадалі паслухаць свайго важака. Тэма сённяшняй гутаркі—мяшчанства.

— Па-мойму,—пачаў ён,—сутнасць мяшчанства—гэта эгаізм, дробязнасць, прагнасць, цынізм... Нямецкі мешчанін апукаваны, а веды яго сталі змрочнай сілай. Вельмі небяспечны мешчанін, калі ён асвойвае новыя сродкі абароны і барацьбы, калі ён спрабуе прабрацца ў галіну асэнсавання чалавечых адносін, у абдумванне жыцця, густаў, разумення прыгажосці... Лозунг мешчаніна: усё для мяне. Ён вітае гуманізм, зразумела—гуманізм «для сябе». Мастацтва, на думку мешчаніна, павінна ўзвышаць адных над другімі. Людзі з дробнымі, абмежаванымі, уласніцкімі інтарэсамі і вузкім ідэйным і грамадскім кругаглядам далі магчымасць Гітлеру і яго хеўры іх абалваніць. Унушыўшы немцам, што яны з'яўляюцца «вышэйшай расай», адукаваныя мяшчане, не задумваючыся, у канцлагерах атруцілі газамі і спалілі ў печах мільёны людзей, выраблялі з чалавечага тлушчу мыла, з валасоў—тканіны, з касцей—угнаенне.

— Няпраўда!—вярнуўся Станіслаў.—Усё гэта—савецкая прапаганда...

— Я сам у маёнтку барона фон Занда рассейваў на полі з чалавечых касцей угнаенне,— пацвердзіў Шыманскі.

Узняўся шум. Гутарка аб мяшчанстве сарвана. Пачалася размова аб радзіме.

— Ведаю куды ты хіліш,—звярнуўся да Кунцэвіча Станіслаў.—Мяне не заарканіш у свой край. Не люблю...

— А мне дарагая тая хатка, дзе нарадзіла матка,—разважаў Кунцэвіч.—Любіць радзіму—значыць аберагаць яе ад нападу ворага, усімі мерамі садзейнічаць яе росту і працвітанню. Сапраўдны патрыёт той, хто любіць не толькі свой народ, але і іншыя народы, з'яўляецца інтэрнацыяналістам.

— А чаго ж ты гэтак нападаеш на немцаў?

— На немцаў?—перапыніў Кунцэвіч.—Не. Немцы розныя бываюць. На фашыстаў.—Ён працягваў.—Быць сынам свае радзімы, гэта значыць, як сын пастаўся да яе, у сто разоў вярні тое, што яна табе дала.

— Нічога я асабіста ад яе не атрымаў.

— У чалавека акрамя асабістага,—гаварыў Кунцэвіч,—ёсць шмат большае—барацьба за гонар радзімы.

— Усё гэта з чужых слоў,—аспрэчваў Станіслаў.—Радзіма мне не маці, а мачаха. Не люблю яе такою, якою яна ёсць. Не цярплю яе людзей. Вельмі ж хутка іх апрацавалі бальшавікі. Беларусы страцілі самастойнасць...

— Не кідай каменем у неба—вернецца на тваю ж галаву,—заключыў Кунцэвіч.

— А што ад яго хацець,—вымавіў Дзегцяр.— Здраднік за агрызкі прадасць родных і блізкіх.

Станіслаў хацеў яшчэ нешта сказаць, а потым плюнуў, махнуў рукою і пайшоў. У лагернікаў ад разважанняў Станіслава астаўся непрыемны асадак. Адчуўшы гэта, Кунцэвіч кінуў:

— У сям'і не без выродка.

— Дакуль мы будзем тут гібець?—запытаўся Кулік.—Чужая старана—цёмны лес.

— Як ні доўгая ноч, дзень прыйдзе,— падбадзёрваў Кунцэвіч.—Вырвемся з пекла!

Дзегцяр на губным гармоніку зайграў усім знаёмую песню, моладзь падхапіла:

Бывайце здаровы,
Жывіце багата.
Ужо ж мы паедзем
Да свае хаты,

— Сціхніце!—зноў вярнуўшыся, немым голасам залемантаваў Станіслаў.

— А ў чым справа?—здзівіўся Дзегцяр.

— Бярэ за сэрца,—тлумачыў Рокаш.—Эх, хлопчыкі, вы яшчэ не ведаеце тугі па радзіме.

— Як?—глянуў на Рокаша Дзегцяр.—Мы любім сваю мову і сваю радзіму.

— Мала гэтага,—сказаў Рокаш.—Трэба абараняць яе ад усіх замахаў. Цяпер ЗША ўзначалілі барацьбу супраць Савецкага Саюза. Над другой радзімай працоўных усяго свету—Краінай Саветаў—навісла новая небяспека. Амерыканскія магнаты згуртоўваюць антыкамуністычны блок... Бяруць у дапамогу недабітых фашыстаў...

— Што вы кажаце?—занепакоіўся Дзегцяр.

— Тое, што вы чуеце,—працягваў Рокаш.—Надоечы я хацеў наведаць лагер у Дахау, там загінуў адзін мой нямецкі сябра, камуніст, які вывеў мяне на дарогу... І што вы думаеце, каб замесці сляды фашысцкіх злачынстваў, гэты лагер ператворан у вайсковую турму для амерыканскіх салдат.

— Цікава,—сказаў Дзегцяр.

— Тады я паехаў у Бухенвальд, што недалёка ад Веймара, дзе працавалі Гётэ і Шылер,— гаварыў Рокаш.—У Бухенвальдзе знішчаны мільёны антыфашыстаў.

— І што?—разявіў рот Дзегцяр.—Няўжо і Бухенвальд зачынілі?

— Не,—адказаў Рокаш.—Смеласці не хапіла. Бухенвальд—сусветна вядомая фабрыка смерці. А дзе Станіслаў Залівака?

— Некуды знік,—паглядзеў навокал Дзегцяр.

— Тады і мне трэба падавацца,—захваляваўся Рокаш.

— Вы не сказалі галоўнага аб сучасным амерыканскім імперыялізме,—цікавіўся Кунцэвіч.

— Сучасны амерыканскі імперыялізм—міжнародны жандар,—спяшаўся Рокаш.—Дамагаючыся шырокага аб'яднання ўсіх антыкамуністычных сіл, ён хоча стаць «вяршыцелем лёсу свету».

— Так сказаць, выправіць памылку гітлераўскай Германіі, якая імкнулася ўласнымі сіламі адолець такога гіганта, як Савецкі Саюз,—здагадаўся Кунцэвіч.

— Во-во!—сцвердзіў Рокаш.—А аб астатнім у другі раз...

І Рокаш выйшаў.

У бараку старыя і пажылыя перамешчаныя асобы, змогшыся за дзень, павячэраўшы, у каго што было, даўно ўжо ўціхамірыліся. Чутно было пахрапванне, некаторыя ў сне ўскрыквалі, сёй-той нешта незразумелае мармытаў. Толькі моладзь яшчэ не спала. Падзяліўшыся на групкі яны паціху размаўлялі.

Шыманскі і Кулік абмяркоўвалі, як усё ж дзенебудзь уладкавацца на пастаянную працу. Не ісці ж па следу Станіслава, які надоечы ўхітрыўся на могілках адкапаць труну і зняць з мерцвяка касцюм. Праўда, не вельмі зарабіў на ім. Касцюм аказаўся тапны. Дый за паўцаны прадаў. Уся гарадская жандармерыя пастаўлена на ногі, каб адшукаць злачынца. Ён ледзь не трапіў у рукі жандара.

У лагеры пачуўся шум. Забегала варта. Неўзабаве ўвайшоў збялелы Станіслаў, які паведаміў, што лагер акружаны жандармерыяй.

— Мусіць, шукаюць вялікага злачынца,—сказаў ён і спытаў:—А дзе Рыгор Рокаш?

— А хто яго ведае,—адказаў Шыманскі.—Некуды пайшоў.

У барак зайшлі камендант лагера і некалькі жандараў.

— Пад'ём!—скамандаваў камендант.

Лагернікі паўскоквалі з нараў.

— Выстраіцца ў адну шарэнгу!—загадаў камендант.

— Рыгора Рокаша шукаюць,—сказаў Станіслаў і выкрыкнуў.—Ён уцёк! Лаві яго!

— На злодзеі шапка гарыць,—іранічна заўважыў Шыманскі.

Напалоханы Станіслаў, убачыўшы жандара, які на барахолцы яго лавіў, выскачыў з акна. Жандары пабеглі за ім.

Госці МІНСКА

ПАХВАЛЮЕМСЯ ЗА ГЮЛІ ЧАХЕЛІ...

Прыгадваюцца тры жнівеньскія вечары мінулага года, калі тэлевізійныя праграмы пачыналіся словамі: «Гаворыць і паказвае Сопат!» З хваляваннем сачылі мы тады за ходам Міжнароднага фестывалю эстраднай песні. Пераможцай фестывалю стала цудоўная грузінская спявачка Гюлі Чахелі. Першую прэмію і ўсеагульнае прызнанне атрымала яна за выкананне польскай песні «SOS» кампазітара Васоўскага.

І вось Гюлі Чахелі ў Мінску. Я сустрэўся з гэтай спявачкай, імя якой ведае кожны аматар музыкі, і папрасіў яе адказаць на пытанні, якія, напэўна ж, цікавяць чытачоў «Літаратуры і мастацтва».

Перш за ўсё я спытаў у Гюлі Чахелі, ці даўно яна на эстрадзе.

— З шаснаццаці год. Пачынала спяваць у Дзяржаўным эстрадным аркестры Грузіі, затым—у аркестрах Алега Лундстрэма і Эдзі Рознера. Вось ужо шэсць гадоў выступаю з самастойнымі праграмамі. І шэсць гадоў мне акампаніруе ансамбль Барыса Рычкова.

— За гэтыя гады, напэўна, вы прымалі ўдзел не ў адной сотні канцэртаў? Якія з іх найбольш запомніліся вам?

— Канечне ж, канцэрты на песенных фестывалях! Я прымала ўдзел у чатырох фестывалях: Міжнародным джаз-фестывалі ў Таліне, у Сопацкім фестывалі, спявала на джазавым фестывалі ў Празе... Самыя свежыя ўражанні ад снежаньскага фестывалю мастацтваў у адным з прыгажэйшых курортаў Кубы—Варадэра...

— Пра Талінскі, Сопацкі, Пражскі фестывалі мы чыталі нямала. А вось пра фестываль у Варадэра—амаль нічога не напісана. Раскажыце, калі ласка, пра яго больш падрабязна.

— На гэтым фестывалі выступілі спевакі больш чым дваццаці краін свету. Я сустрэла тут шмат старых знаёмых яшчэ па Сопаце і Празе. Выступілі тут польскі квартэт «Нові», француз Жазе Бартэль (ён, дарэчы, спявае ў фільме «Шэрбурскія парасоны»), спявак з вострава Барбадос Лес Карлтон, польская спявачка Ева Дэмарчык і многамнога іншых. Усяго было каля ста выканаўцаў. Прэміі на фестывалі не прысуджаліся. Кожны мог спяваць колькі хацеў. Усё залежала ад таго, спадабаўся ты слухачам ці не.

— І як жа выступілі вы?

— Я праспявала некалькі песень. Сярод іх—«SOS» Васоўскага, «Жоўтыя лісці» Мурада Кажлаева, «Чаруючы рытм» Гершвіна. Поспех быў вялікі. Але самы вялікі поспех прыйшоў пасля сюрпрызу, які я падрыхтавала кубінцам. Пра мой сюрпрыз не ведаў ніхто, нават аркестр, паколькі спявала я пад акампанемент Барыса Рычкова. Гэта была песня з рэпертуару кубінскай спявачкі Элены Бурке «Балюча». Выкананне гэтай песні кубінцы сустрэлі стоячы. Мне здаецца, што яны нават прымалі мяне за сваю...

Мне хочацца зрабіць невялікае адступленне ад інтэрв'ю і прывесці словы кубінскага кампазітара Карласа Фарыньяса пра гэты фестываль: «Лепш за ўсіх, мне здаецца, спявала Гюлі Чахелі. Калі яна выконвала «Балюча», мы поўнасцю здолелі ацаніць яе як выканаўцу. Мяне больш за ўсё зацікавіла, як яна здолела зразумець і выявіць дух нашай песні».

— Вы сказалі, што спявалі гэтую песню толькі пад фартэпіяна. А ўвогуле вы аддаеце перавагу спяванню ў суправаджэнні вялікага аркестра ці маленькага—трыо, квартэта?

— Гэта залежыць ад песні. Рытмічныя, «свінгавыя», рэчы «смачней» гучаць пад аркестр. Але трыо дае больш магчымасцей выявіць філасофскі сэнс песні.

— Хто ваш любімы кампазітар?

— Мікаэль Тарывердзіеў і Мурад Кажлаеў. У іх песнях якраз і ёсць той філасофскі змест, пра які я гаварыла. Апрача таго, у гэтых песнях на дзіва разумна спалучаюцца музыка і тэкст. А ўвогуле люблю многіх кампазітараў—і нашых, і замежных. Вельмі люблю грузінскія песні.

— Вы мяркуеце, што развіццё джаза мусіць пайсці паводле нацыянальных традыцый?

— Безумоўна! Існуе ж свая, нацыянальная школа грузінскага, эстонскага джаза...

— Якое самае яркае ў вас мінскае ўражанне?

— Сустрэчы з мінскімі слухачамі...

— І апошняе пытанне. Скажыце, які з атрыманых вамі букетаў запомніўся больш за ўсё?

— Гэта было ў Сопаце. На сцэну выбегла дзяўчынка, вельмі падобная на маю дачку. Гэты букет я запомніла назаўсёды...

Чытачы, напэўна, здзівяцца: а дзе ж традыцыйнае пытанне пра творчыя планы? Прызнаюся—я задаваў яго спявачцы. Але Гюлі Чахелі сказала толькі пра тое, што рыхтуецца да Сопацкага фестывалю 1968 года—па традыцыі яна адкрые яго як пераможца мінулагодняга конкурсу. Рыхтуецца яна яшчэ да... Стоп! Вось пра гэта спявачка прасіла пакуль што не пісаць. Не, яна не верыць у забабоны, але ўсё ж такі... Давайце ж цярпліва пачакаем і пахвалюемся за Гюлі Чахелі, як хваляваліся мы ў час Сопацкага фестывалю летась. А пакуль што пажадаем Гюлі Чахелі новых творчых поспехаў.

Г. БАРЫСАЎ.

Імправізацыя спецыяльна для фотакарэспандэнта... Але зараз ён пойдзе, і пачнецца сапраўдная работа.

На здымку — Людміла Калечыц і Міхаіл Прошкін, навучэнцы Мінскага харэаграфічнага вучылішча. Пройдзе час, і яны займуць свае месцы ў тэатрах краіны, як і дзесяткі ранейшых выпускнікоў вучылішча.

Фота М. МІНКОВІЧА.

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ

імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯВЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА ПЕРШЫ КУРС НАВУЧАННЯ З АДРЫВАМ І БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ (ЗАВОЧНАЕ НАВУЧАННЕ) НА 1968 – 1969 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД.

Прыём на факультэты: ВЫКАНАЎЧЫ па спецыяльнасцях: фартэпіяна, скрыпка, альт, віяланчэль, кантрабас, арфа, флейта, габой, кларнет, фагот, валторна, труба, трамбон, туба, ударныя інструменты, цымбалы, баян, домра, балалайка, акардэон, харавое дырыжыраванне і КАМПАЗІЦЫІ І МУЗЫКАЗНАЎСТВА.

ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ АКАРДЭОН, СПЯВАННЕ І ОПЕРНА-СІМФАНІЧНАЕ ДЫРЫЖЫРАВАННЕ ПРЫЁМ ТОЛЬКІ НА НАВУЧАННЕ З АДРЫВАМ АД ВЫТВОРЧАСЦІ.

У кансерваторыю прымаюцца мужчыны і жанчыны, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю і праявілі творчае дараванне, актыўна ўдзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці і атрымалі рэкамендацыі з месца работы або вучобы.

Па спецыяльнасці оперна-сімфанічнае дырыжыраванне прымаюцца на паўторны курс навучання асобы, якія маюць закончаную вышэйшую адукацыю і праявілі здольнасці ў галіне дырыжыравання.

На навучанне з адрывам ад вытворчасці прымаюцца асобы ва ўзросце да 35 гадоў (па спецыяльнасці спяванне—ад 18 да 28 гадоў) і на завочнае навучанне без абмежавання ўзросту пасля паспяховай здачы ўступных экзаменаў па наступных прадметах:

1. Спецыяльнасць.
2. Руская мова і літаратура (пісьмова і вусна).
3. Гісторыя СССР (вусна).

Экзамен па спецыяльнасці ўключае раздзелы:

— выкананне сольнай праграмы (для выканаўцаў),
— сачыненне (для кампазітараў),
— музычная літаратура (для музыказнаўцаў),
— сальфеджыо,
— гармонія (акрамя ваналістаў),
— элементарная тэорыя музыкі (для ваналістаў),
— фартэпіяна (для дырыжораў, кампазітараў, музыказнаўцаў),
— калоквіум.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара з указаннем выбранай паступаючым спецыяльнасці і формы навучання (дзённае, завочнае).

Да заявы прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале), характарыстыка і рэкамендацыя для паступлення ў ВНУ, аўтабіяграфія, медыцынская даведка (форма № 286), 4 фотакартачкі (здымкі без галаўнога ўбору, памерам 3Х4 см.).

Паступаючы павінен асабіста прад'явіць пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпісное пасведчанне (асобам прызыўнога ўзросту).

Заявы прымаюцца з 1-га чэрвеня па 4 ліпеня па адрасу: Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Уступныя экзамены для паступаючых на навучанне з адрывам ад вытворчасці і без адрыву ад вытворчасці з 5 па 25 ліпеня 1968 г.

НОВЫЯ ЭСТАМПЫ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ



У. САДЗІН. «У Саянах» (лінагравюра).

МАЙСТРЫ БРАТНІХ ЗАРУБЕЖНЫХ ЛІТАРАТУР

У СВЕЦЕ САПРАЎДНЫМ

Яраслаў Івашкевіч нарадзіўся і вырас на Украіне. Такое паходжанне вызначала некаторыя своеасаблівыя рысы многіх польскіх пісьменнікаў—выхадцаў з так званых «украінных» раёнаў старой Польшчы. У перыяд рамантызму гаварылі нават аб украінскай «школе» ў польскай літаратуры.

Івашкевіч нарадзіўся ў 1894 годзе непадалёк ад Кіева. Бацька пісьменніка за ўдзел у студзеньскім паўстанні 1863 года быў выключаны з Кіеўскага універсітета і да канца жыцця працаваў бухгалтарам. У сям'і жыва цікавіліся літаратурай, музыкай і грамадскім жыццём Польшчы. У гімназічныя і студэнцкія гады будучы пісьменнік часта бываў у сваякоў Шыманоўскіх. Найбольш цікавым чалавекам з акружэння маладога Івашкевіча, які зрабіў на яго значны ўплыў, быў стрыечны брат Яраслава—Караль Шыманоўскі, славуты польскі кампазітар. У Шыманоўскіх Івашкевіч сустракаўся таксама з маладым Артурам Рубінштэйнам. Так паглыбляліся музычныя веды і выпрацоўваўся музычны густ будучага аўтара кніг аб Шапэне, Баху і тым жа Шыманоўскім. Відаць, у гэтыя гады і ўзнікла задума напісаць сумесна з Шыманоўскім оперу «Кароль Рогер», рэалізаваная пазней.

Аднак ужо тады для Івашкевіча на першым плане стаяла літаратура. Ён чытаў Уайльда, Чэстэртона, Ніцшэ, рускіх пісьменнікаў, з якіх асабліва блізкія яму назаўсёды сталі Талстой і Тургенеў, чытаў французскіх класікаў, захапляўся творамі Выспянскага. Асобнае месца займаў сярод яго любімых пісьменнікаў Рэмбо, чые «Азарэнні» Івашкевіч першы пераклаў на польскую мову. Да таго ж перыяду адносяцца і яго раннія спробы арыгінальнай літаратурнай творчасці.

Пасля рэвалюцыі ў Расіі малады Івашкевіч трапіў у Варшаву. Ішоў 1918 год. У літаратуры ўзяло слова новае пакаленне. Найбольшую вядомасць набыла паэтычная група «Скамандр», да якой належаў і Я. Івашкевіч. Перыяд сумесных выступленняў (паэты чыталі свае вершы ў варшаўскім кафэ «Пад пікадорам») працягваўся нядоўга, Івашкевіч адышоў ад «Скамандра». Інакш і не магло быць. Івашкевіч заставаўся ў паэзіі прышэльцам з украін, які імкнуўся перадаць іх каларыт і пейзаж: урбанізму сваіх таварышаў ён супрацьстаўляў вёску, дынамізму і публіцыстычнаму запалу галоўных прадстаўнікоў «Скамандра»—роздум над бяссэнсіцай існавання, над недаўгавечнасцю шчасця.

У той жа перыяд Івашкевіч робіць свае першыя крокі ў мастацкай прозе. Яго невялікая аповесць «Гілярый, сын бухгалтара», у 1925 годзе адзначаная Прэміяй выдаўцоў, у многім аўтабіяграфічная, расказвае аб спадзяваннях і расчараваннях маладога паэта, які з далёкай правінцыі прыехаў у сталіцу. Героем свайго рамана «Месяц узыходзіць» Івашкевіч таксама зрабіў маладога пісьменніка. Дзеянне гэтага рамана разгортваецца на Украіне, апісаны з вялікай экспрэсіяй. Івашкевіч здолеў не толькі паказаць прыгажосць украінскай прыроды, але і трапна ахарактарызаваць асяроддзе, у якім знаходзіцца герой.

У 1925 годзе пачынаецца вельмі інтэнсіўны перыяд у жыцці Яраслава Івашкевіча. Ён удзельнічае ў шматлікіх з'ездах і кангрэсах Пен-клуба, Еўрапейскага інтэлектуальнага саюза, шмат падарожнічае па Еўропе. Асабліва палюбілася яму Сіцылія, якой ён потым прысвяціў «Кнігу аб Сіцыліі» і зборнік выдатных «Італьянскіх навел». Малады пісьменнік становіцца дыпламатам і ў гэтай ролі едзе ў 1927 годзе ў Капенгаген. Там Івашкевіч правёў тры гады, якія мелі вялікае значэнне для яго далейшай творчасці. Ён вывучыў дацкую мову і чытаў дацкую літаратуру ў арыгінале, цікавіўся гісторыяй і культурай гэтай краіны, аб якой пасля вайны напісаў поўную глыбокага захаплення кнігу «Гняздо лебедзяў». Дацкая літаратура і мастацтва, наогул скандынаўская культура, прыцягнулі ўвагу Івашкевіча. У Польшчы ён стаў адным з віднейшых яе знаўцаў і прапагандыстаў, заняўся перакладамі твораў скандынаўскіх аўтараў.

Сустрэчы з Еўропай, з лепшымі пісьменнікамі таго часу вывелі Івашкевіча з зачараванага кола ўспамінаў аб Украіне. Яго паэтычны зборнік «Вяртанне ў Еўропу» пранізаны думкай аб агульнай культурнай спадчыне еўрапейцаў. А ў драме «Любоўнікі з Вероны», дзе Івашкевіч па-свойму інтэрпрэтуе і вырашае канфлікт шэкспіраўскіх «Рамэа і Джульеты», крытыка ўгледзела замаскіраваны паказ складаных узаемаадносін паміж палякамі і немцамі.

Яшчэ большую цікавасць і шырокую дыскусію выклікаў выдадзены ў 1934 годзе гістарычны раман Івашкевіча «Чырвоныя шчыты». Аўтар звярнуўся ў ім да XII стагоддзя, да перыяду феадальнай раздробленасці Польшчы, і галоўным героем зрабіў мала вядомага з гісторыі ўласніка аднаго з невялікіх польскіх княстваў. Пісьменнік вывеў князя Генрыка на еўрапейскую арэну, ператварыў яго ў удзельніка важнейшых падзей той эпохі. Івашкевіч апавядае пра адукаванага князя, які добра разбіраецца ў механізме еўрапейскай палітыкі і імкнецца да аб'яднання Польшчы. У «Чырвоных чытах» узнікае драма «нездзяйснення», якая ў розных варыянтах паўтараецца ў наступных творах Івашкевіча. Амаль дасягнуўшы мэты, калі яму ўжо адкрыты шлях да трона ў Кракаве, князь Генрык адступае, адмаўляецца ад усіх сваіх ранейшых намераў.

З кніг, напісаных Івашкевічам у 30-я гады, адзначым яшчэ раман «Змова мужчын», аповесць «Блендамерскія страсці» і зборнік вершаў «Лета 1932», напоўнены сумным роздумам над рэчаіснасцю. У пазнейшым зборніку «Іншае жыццё» ён шукае выратавання ў свеце мастацтва, звяртаецца да ранейшых сюжэтаў-міфаў, да старой культуры, піша вершы-споведзі аб сваіх перажываннях, выкліканых палотнамі Анры Русо, Сіньарэлі, Брэйгеля.

Аднак найбольшае прызнанне прынёс Івашкевічу зборнік апавяданняў «Панны з Вілька». У гэтым жанры яму суджана было дасягнуць дасканаласці, узняцца на вяршыні майстэрства. Гэты зборнік абвясціў з'яўленне такіх яго навел, як «Ружа» і «Зігфрыд», якія атрымалі высокую ацэнку, а таксама напісаных ужо ў гады вайны апавяданняў «Ікар», «Маці Іаана ад Анёлаў», «Бітва на раўніне Седжэмур», «Старая цагельня», «Качгрэс у Фларэнцыі», «Млын на Лютыні» і многіх іншых. Перш за ўсё ў навелах Івашкевіча прыцягваюць увагу партрэты людзей. Трагедыі, ледзь улоўныя або бурныя, заўсёды адзначаны паглыбленым псіхалагізмам. «Проза Івашкевіча, набываючы інтэлектуальны характар, у той жа час ніколі не ператвараецца ў абстрактную дэманстрацыю ідэі, у філасофскую аповесць, — пісаў адзін з крытыкаў.—У яе выдуманым свеце чытач адчувае сябе гэтак, як у свеце сапраўдным».

Яшчэ да вайны Івашкевіч дэбютаваў у драматургіі. Пасля «Любоўнікаў з Вероны» ён напісаў п'есу «Лета ў Наане» пра Шапэна і Жорж Санд. Гэта п'еса перакладалася і ставілася ў многіх краінах. П'еса Івашкевіча «Маскарад» прысвечана Пушкіну. У створанай пасля вайны п'есе «Вяселле пана Бальзака» ён паказвае французскага пісьменніка на Украіне, у маёнтку Эвеліны Ганскай, у экзатычным для Бальзака асяроддзі жыхароў украінных польскіх сядзіб.

Увесь перыяд гітлераўскай акупацыі Івашкевіч правёў у Польшчы. Ён жыў пад Варшавай і нястомна працаваў, хоць, зразумела, не мог друкавацца. Дом яго стаў прытулкам для многіх літаратараў і мастакоў, якім даводзілася хавацца. У гэты перыяд узніклі лепшыя апавяданні пісьменніка, цыклы вершаў «Цёмныя сцяжынкі», «Плеяды», а таксама вельмі цікавая «Кніга маіх успамінаў». У многіх з гэтых твораў адлюстравана жыццё польскага народа ва ўмовах гітлераўскага тэрору, адвага і гераізм звычайных, «шэрых» людзей.

Пасля вайны Яраслаў Івашкевіч актыўна ўключыўся ў культурнае жыццё краіны. Выйшлі ў свет яго творы, напісаныя ў перыяд акупацыі. За зборнік «Італьянскія навелы» яму прысудзілі самую высокую ў той час прэмію штотыднёвіка «Одродзэнне». Ён быў выбраны ў дэпутаты сейма, удзельнічае ў руху абаронцаў міру, узначальвае Саюз польскіх пісьменнікаў. Выйшлі новыя зборнікі яго вершаў, Івашкевіч напісаў «Пісьмы з Паўднёвай Амерыкі», кнігі аб Сіцыліі і Даніі, пераклаў Шэкспіра, Андэрсена, Талстога, Чэхава і многіх іншых. Ужо каля пятнаццаці гадоў Івашкевіч з'яўляецца рэдактарам штомесячнага літаратурнага часопіса «Твурчосць».

У 1962 годзе выдадзены яго трохтомны раман «Чэсць і слава»—твор шырокага эпічнага размаху, дзе ўзноўлены лёс некалькіх пакаленняў, дзве сусветныя вайны, рэвалюцыйныя падзеі 1917 года на Украіне і 1945 год у Польшчы. На такім багатым матэрыяле Івашкевіч вяртаецца да філасофскай рэфлексіі, будуе гісторыка-філасофскія і маральна-этычныя абагульненні. Ён зводзіць рахункі з цэлай эпохай, стварае раманэпітафію класу, для якога 1945 год у Польшчы азначаў поўную пагібель, нарэшце, падсумоўвае свой уласны жыццёвы і мастацкі вопыт.

Эпапея «Чэсць і слава» ў нейкай ступені ўвянчала багаты творчы шлях пісьменніка, але не завяршыла яго. Пасля выдання гэтага рамана Яраслаў Івашкевіч стварае ўсё новыя творы, і кожны з іх—сур'ёзны ўклад у польскую літаратуру. Апублікаванае год таму назад апавяданне Івашкевіча «Касцёл у Скарышаве» было прызнана адным з найбольш цікавых у сучаснай польскай прозе.

Мацей КРАСІЦКІ.

(Агенцтва ІНТЭРПРЭС для ЛІМа).

У НАШЫХ СЯБРОЎ

ПЕРАМОЖНЫМ ПОСТУПАМ

Сёння — Дзень балгарскай культуры і асветы, славянскай пісьменнасці і балгарскага друку.

Самыя папулярныя культурныя ачагі ў Балгарыі—народныя чыталішчы, якія ўзніклі задоўга да вызвалення краіны ад атаманскага ярма. Балгарскі народ, нягледзячы на ўціск прыгнятальнікаў, аберагаў іх, як святыні. Чыталішчы, г. зн. народныя чытальні, былі не толькі рассаднікамі культуры, але і важнымі цэнтрамі нацыянальна-вызваленчай барацьбы. У Балгарыі вядомы імёны многіх арганізатараў і кіраўнікоў чыталішчаў, палымяных прыхільнікаў нацыянальнай культуры і выдатных рэвалюцыянераў.

Сучасныя чыталішчы — гэта дамы і палацы культуры. Яны існуюць ва ўсіх гарадах і сёлах краіны і з'яўляюцца яркім паказчыкам бурнага росквіту балгарскай культуры. Толькі за апошняе дзесяцігоддзе было пабудавана больш як тысяча такіх дамоў культуры. Яны маюць выдатныя бібліятэкі, у іх дзейнічаюць тысячы гурткоў мастацкай самадзейнасці, больш за 600 дзіцячых музычных школ, вядзецца вялікая культурна-асветная работа.

Выдатныя поспехі дасягнуты і ў іншых галінах культурнага жыцця. Цяпер у балгарскіх ВНУ вучыцца 85 тысяч студэнтаў—у 8 разоў больш, чым у 1939 годзе. Па колькасці студэнтаў на 10 тысяч жыхароў Балгарыя займае адно з першых месц у свеце і пераўзыходзіць такія краіны, як Францыя, Англія і Італія. У краіне ўведзена абавязковае сямігадовае навучанне, створана шырокая сетка прафесіянальных школ, тэхнікумаў і іншых навучальных устаноў. Зараз у Балгарыі вучыцца кожны чацвёрты чалавек.

Сапраўдным здабыткам народа стаў друк. Выраслі тыражы газет і часопісаў, з кожным годам пашыраецца кнігавыдавецкая справа. Цяпер на кожнага жыхара прыпадае пяць выдадзеных за год кніг. Бібліятэчны фонд краіны складае больш як 40 мільёнаў тамоў. За гады народнай улады колькасць бібліятэк падвоілася.

Вялікія поспехі дасягнуты ў развіцці літаратуры і мастацтва. Балгарская музыка, асабліва вакальнае мастацтва, заваявала міжнароднае прызнанне. Расквітнеў цэлы букет талентаў, сярод якіх першае месца па праву належыць праслаўленаму балгарскаму опернаму спеваку Мікалаю Гяураву, які здабыў славу «лепшага баса сучаснасці». Балгарскія музычныя і харавыя ансамблі з нязменным поспехам выступаюць у многіх краінах свету, вакалісты атрымалі перамогі на многіх міжнародных конкурсах.

Квітнее балгарскае выяўленчае мастацтва. Хутка набірае сілы маладая кінематаграфія. Многія балгарскія фільмы адзначаны медалямі і прызамі на міжнародных кінафестывалях.

У побыт працоўных трывала ўвайшло радыё. Па колькасці радыёпрыёмнікаў на 100 жыхароў Балгарыя займае першае месца на Балканах. У бліжэйшы час будзе завершана поўная радыёфікацыя краіны. Хутка развіваецца і балгарскае тэлебачанне.

Балгарская камуністычная партыя праяўляе пастаянныя клопаты аб культурным будаўніцтве, робіць усё для таго, каб дасягненні сацыялістычнай культуры былі цалкам пастаўлены на службу народа.

Дзмітрый БАЧАРОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Сафія.

Куток калекцыянера

«ВІЗІТНАЯ КАРТКА» КРАІНЫ

З кожным годам расце колькасць збіральнікаў марак братніх сацыялістычных краін. «Візітныя карткі» Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Польшчы Румыніі і Чэхаславакіі хутка раскупаюцца філатэлістамі. Цэнтральнае філатэлістычнае агенцтва «Саюздрук» рэгулярна выдае каталогі.

Зараз выпушчаны каталог паштовых марак Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Польшчы, Румыніі і Чэхаславакіі 1966 года.

Маркі нашых сяброў адлюстроўваюць важнейшыя падзеі міжнароднага жыцця. На адной з паштовых мініяцюр Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі паказана в'етнамская дзяўчына з вінтоўкай і кветкай. Тэкст на марцы: «Непераможны В'етнам». На другой марцы ГДР—руіны французскага гарадка Арадур-сюр-Глана, знішчанага разам з жыхарамі фашыстамі ў гады другой сусветнай вайны.

Каталог сведчыць аб пашырэнні традыцыйных тэм — «фауна», «спорт», «космас», «мастацтва». Мяркай пасадцы на Месяц савецкай аўтаматычнай станцыі «Месяц-9», напрыклад, прысвечаны мініяцюры ўсіх шасці краін. На марках Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі ўзноўлены творы майстроў жывапісу, папоўнілася традыцыйная серыя, якая расказвае аб Пражскім Крамлі. Выйшаў памятны блок у гонар 100-годдзя шэдэўра чэшскага музычнага мастацтва— камічнай оперы Б. Сметаны «Прададзеная нявеста».

Міхаіл ВАСЮНЬКІН,
начальнік Выдавецкага аддзела Цэнтральнага філатэлістычнага агенцтва «Саюздрук».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

24 мая

Першая праграма. 10-30—школьная фільматэка. Для вучняў 10-х класаў. «Ціхі Дон». Мастацкі фільм. Першая серыя. 17-00—«Навіны». 17-10—праграма перадач. 17-15—Н. Тарасенкава. «Антон і Анка». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Растова-на-Доне. 18-00—«Нацыянальны даход сацыялістычнага грамадства». Гутарка кандыдата эканамічных навук С. А. Ходаса. 18-30—«Клуб кінападарожнікаў» (М). 20-00—«Эстафета навін» (М). 21-00—аматарам эстрады. Канцэрт (М). 22-00—тэлевізійны тэатр мініяцюр. «Усё пра футбол» (М). 23-00—«5+2». Штотыднёвы агляд. 23-40—«На сон надыходзячы». Музычная праграма.

Другая праграма. 10-05—тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для школьнікаў. Мультыплікацыйны фільм (М). 10-30—«На палях краіны» (М). 11-00—літаратурны тэатр. «Ён быў маім сябрам». Аляксандр Адоеўскі (М). 11-45—«Рэха спартыўнага свету» (М). 12-15 — для школьнікаў. «Калі ўрокі зроблены». Перадача з Будапешта 17-05—тэлевізійныя навіны (М). 17-15—«Анафема». Кароткаметражны фільм. 18-00 — для малодшых школьнікаў. «Свецішь зорачка (М). 20-00—«Стары ядок». Мастацкі фільм. 21-20—па роднай краіне. «Мыс Гнядога Скакуна», «Сонца над Нявой». Кінанарысы. 22-00 — «Як Джоні Скікі трапіў у пекла». Фільм-опера. 23-00—у эфіры—«Маладосць» (М). 23-20—«Толькі факты». Праграма перадач. «Музычны маяк».

25 мая

Першая праграма. 8-55—праграма перадач. 9-00—«Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45—тэлевізійныя навіны (М). 10-00—«З днём нараджэння!». Музычная вясёлая праграма (М). 10-30 — для студэнтаў вну. «Вышэйшая матэматыка». I курс. 11-00—«Вышэйшая матэматыка». II курс. 12-00—«Фізіка». 12-30—«Тэхналогія металаў». 13-00—«Фізкультура і спорт». Тэлевізійны часопіс. 13-30—«Музычны кіёск» (М). 14-00 — для юнацтва К. Сімонаў. «Дым айчыны». Спектакль Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола (М). 15-30 — у эфіры «Маладосць». «Я—з 60-х». Трансляцыя на Маскву. 16-30—праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — «Аперацыя «Трэст». Прэм'ера шматсерыйнага тэлевізійнага мастацкага фільма. Трэцяя серыя (М). 19-30—«Я—з 60-х» (М). 20-45—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15—«У свеце вобразаў, слова і фарбаў». Тэлевізійны часопіс. 22-00—майстры мастацтваў. «Зоя Фёдарава» (М). 23-15—тэлевізійныя навіны (М) 23-30—праграма перадач. 23-35—эстрадны канцэрт (М).

Другая праграма. 10-30—«Як вас абслугоўваюць». Суботні рэпартаж. Перадача з Вільнюса. 11-00—«Мастацтва і мы». Тэлевізійны часопіс. Перадача з Адэсы. 12-00—«Вяртанне Коста». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 13-30—«Суботні рэпартаж» (М). 18-50—да Дня пагранічніка. «24 гадзіны на заставе». Кінанарыс. 19-10—«Горкае зерне». Мастацкі фільм. 20-35—майстры мастацкага слова. «Вершы і проза савецкіх пісьменнікаў». Чытае заслужаная артыстка РСФСР М. Елісеева. 21-15—у эфіры—«Маладосць». Перадача з Вільнюса. 21-50—«Навіны дня». Кіначасопіс (М). 22-00—«Белыя ночы». Фільм-канцэрт.

26 мая

Першая праграма. 8-55—праграма перадач. 9-00—«На зарадку станавіся!» (М). 9-15—«Будзільнік» (М). 9-45—тэлевізійныя навіны (М). 10-00—тэлевізійны каляндар. «Сёння—Дзень хіміка» (М) 10-30—«Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. Аматарам шахмат. 11-00—да Дня пагранічніка. «На варце Радзімы». Выступленне палкоўніка Д. Ф. Кураева. 11-15—«Музычная шкатулка» 11-30—дзіцячы экран. «Першая экспедыцыя». Мультыплікацыйны фільм. «Прыгоды ката-хвалько». Лялечны фільм. 12-25 — для школьнікаў. «Сімфонія зямнога шчасця». Навукова-пазнавальная перадача. 13-00—«Майстры мастацтваў — пагранічнікам» Канцэрт (М). 15-00—«Караблі не паміраюць». Дакументальны фільм. 16-00—«Чараўнікі». Да Дня хіміка. 16-30—праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00—«Аперацыя «Трэст». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма. 4-я серыя (М). 19-30—«Еўропа: падзеі, краіны, праблемы» (М). 20-15 — В. Шкваркін. «Страшны суд». Спектакль Маскоўскага драматычнага тэатра імя Гогаля. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 22-30—у эфіры—«Маладосць». «Гарызонт». Перадача з Ленінграда. 12-15—для школьнікаў. «Свята на вадзе» (М). 15-00—«Прагрэс». Інтэрвізійны часопіс (М). 15-30—для школьнікаў. Канцэрт ансамбля песні і танца Маскоўскага гарадскога Падарэ піянераў пад кіраўніцтвам В. С. Локцева (М). 19-00—«Адны непрыемнасці». Мастацкі фільм. 20-20—«Край заліва». Фільм-канцэрт. 20-40—майстры мастацкага слова. «Сучасная савецкая паэзія». Чытае заслужаны артыст РСФСР А. Ганчароў.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01754.